

ЧЫМ БАГАТЫЯ НАШЫ НЕТРЫ

7

ДАКУМЕНТЫ ЗВЯЗВАЮЦЬ МІНУЛАЕ І БУДУЧЫНЮ

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. АЎТОРАК № 196 (30330)

## Афіцыйна

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю.**

Пасля прылёту кіраўнік дзяржавы каля трапа самалёта сцісла абмеркаваў некаторыя рабочыя пытанні, што датычацца беларуска-расійскага супрацоўніцтва, з дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем Мезенцавым і паслом Беларусі ў Расіі Аляксандрам Рагожнікам.

Плануецца, што сёння ў Маскве беларускі лідар прыме ўдзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД.

Парадак дня саміту вельмі шырокі. Чакаецца, што лідары краін Садружнасці разгледзяць пытанні, звязаныя з ажыццяўленнем бяспекі, сферай высокіх тэхналогій, гандлёва-эканамічным і культурна-гуманітарным супрацоўніцтвам.

Як паведаміў генеральны сакратар СНД Сяргей Лебедзеў, Аляксандр Лукашэнка на саміце выступіць з дакладам па пункце парадку дня, звязаным з прыняццем Звароту да народаў краін Садружнасці і сусветнай грамадскасці ў сувязі з 80-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў.

Праграмай рабочага візіту Аляксандра Лукашэнкі таксама запланаваны мерапрыемствы ў рамках нефармальных узаемаадносін лідараў краін СНД.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр РАГОЖНІК, пасол Беларусі ў Расіі:**

*«Па мікраэлектроніцы, авіябудаванні, станкабудаванні двюма краінамі былі падпісаны дарожныя карты. Сёння падпісана ўжо 27 праектаў на суму 105 млрд расійскіх рублёў. У прапрацоўцы дадатковы пул праектаў, якія будуць з расійскім бокам разгледжаны з тым, каб гэтую суму крэдыту павялічыць як мінімум да 200 млрд. Сёння на разглядзе расійскага боку сем праектаў на агульную суму больш за 70 млрд рублёў. І мы гэту работу не спыняем».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ВЫ — НЕ ПРОСТА ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА, ВЫ — АПОРА НАШАЙ КРАІНЫ»

### Прэзідэнт прыняў удзел у цырымоніі ўшанавання аграрыяў фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2024» у Мікашэвічах

**Звяртаючыся да жыхароў Брэстчыны і гасцей гэтай добрай пладавітай зямлі, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што больш за чвэрць стагоддзя таму (у 1996 годзе) тут, на Палессі, прайшло першае ў гісторыі суверэннай Беларусі рэспубліканскае свята «Дажынкі».**



Фота БелТА.

### «МЕНАВІТА СЕЛЯНІН ТАДЫ ВЫРАТАВАЎ КРАІНУ»

«Час быў вельмі складаны: абвал эканомікі, пра вёску казаць няма чаго ўвогуле — поўнае збядненне, спад вытворчасці і перш за ўсё сельскагаспадарчай прадукцыі, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Але самае страшнае, як я памятаю, у той час было не спад. Самае страшнае было ў той час ліхалецце. Мы не ведалі, што рабіць, куды ісці, якім шляхам ісці — словам, разброд і бадзянне. Хто старэйшы, павінен памятаць, што мы тады літаральна стаялі на краі бездані. А хтосьці ўжо быў там. І ў нас былі два варыянты: або змагацца за права свабодна і годна жыць на сваёй зямлі, захаваўшы ні, або ўсім акунуцца і апынуцца там, у гэтай бездані, і загінуць. Было вельмі цяжка».

Тады, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, актыўна, нягледзячы ні на што, людзі дапамагалі маладому Прэзідэнту. «І ваша падтрымка, і ваша вера заўсёды мяне натхнялі, — адзначыў ён. — І мы не схіліліся. Мы выстаялі».

Хаця, па словах Прэзідэнта, даводзілася рэальна ў ручным рэжыме, па драбках збіраць сродкі, грошы на паліва, насенне і ўгнаенні, каб гаспадаркі змаглі пасеяць і ўбраць хоць нейкі ўраджай. Большасць гэта добра памятае. «Як бы пафасна гэта ні гучала, менавіта селянін тады выратаваў краіну, — звярнуў увагу беларускі лідар. — І на славу чалавека працы мы правялі свае першыя «Дажынкі». Фестываль стаў гімнам працаўнікам вёскі, цяжкай і высакароднай сялянскай працы. Гэтай традыцыі мы прытрымліваемся дагэтуль, крыху відазмяніўшы яе. Нядзіўна, што нашы «Дажынкі» за гэтыя гады ператварыліся ў свята ўсёй краіны. Сапраўды народнае свята, бо без хлеба не будзе ніякіх песняў, нічога не будзе».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў: жыццё даказала, што беларусы абсалютна правільна выбралі стратэгію — вызначылі харчовую бяспеку адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. Як удакладніў беларускі лідар, асноўным прыярытэтам. Прэзідэнт паведаміў, што плануе пабываць ва ўсіх абласцях, каб нізка пакланіцца і падзякаваць працаўнікам вёскі.

«Вы — не проста харчовая бяспека, вы — апора нашай краіны, — звяртаючыся да аграрыяў, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Вы выратавалі гэту краіну і трымаеце яе ў самыя складаныя часы на сваіх плячах».

СТАР. 2-3

Адзін раён — адзін праект

# СПРАВА ЎПАКОЎКІ

### Новы вытворчы цэх адкрыўся ў Гатаве





Фота Лізаветы ГОПАД.

**Рэгулярнае пашырэнне і мадэрнізацыя ўжо стала добрай традыцыяй для ТАА «Эфектыўныя сістэмы ўпакоўкі», якое пачало сваю гісторыю 23 гады таму ў горадзе Гродне. На мінулым тыдні ў раёне аграгарадка Гатава пад Мінскам з'явіўся новы сучасны вытворча-складскі комплекс для арганізацыі цэха гафрацыі і ўпакоўкі дзякуючы інвестыцыйнаму праекту «Адзін раён — адзін праект».**

— Вытворчую пляцоўку ў Мінскім раёне ў аграгарадку Гатава мы набылі ў 2012 годзе. У 2015 годзе рэалізавалі свой першы інвестыцыйны праект. Так, стварылі самую сучасную ва Усходняй Еўропе вытворчасць поліамідной каўбаснай абалонкі. І ўжо ў 2022 годзе мы прыступілі да рэалізацыі нашага другога інвестыцыйнага праекта — будаўніцтва вытворча-складскога комплексу для арганізацыі цэха гафрацыі і ўпакоўкі з дапаможнымі памяшканнямі, — падзяліўся дырэктар прадпрыемства Юрый Казлоў.

СТАР. 4

# «ВЫ — НЕ ПРОСТА ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА,

## «МЕНАВІТА ЭКСПАРТ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ПРАДУКЦЫІ ДАЎ АСТАТНІМ ГАЛІНАМ МАГЧЫМАСЦЬ АДАПТАВАЦЦА ДА НОВАЙ СІТУАЦЫІ»

Па словах Прэзідэнта, у складаны час беларусы накармілі сябе, а сёння дзякуючы ўсім, хто кожны дзень палівае потам нашу зямлю-карміцельку, Беларусь выйшла на перадавыя пазіцыі ў свеце па экспарце харчавання. Ён падкрэсліў, што нашы прадукты добра ведаюць і любяць далёка за межамі Беларусі. «Скажу больш: ва ўмовах незаконных фашысцкіх беспрэцэдэнтных санкцый, якія апошнія гады ўводзяць супраць нашай дзяржавы, менавіта экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі даў астатнім галінам магчымасць адаптавацца да новай сітуацыі і пераарыентавацца на іншыя рынкі збыту, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Я ўжо не кажу, што праца аднаго работніка аграпрамысловага комплексу стварае да дзясятка працоўных месцаў у сумежных галінах».

Адзначыў Прэзідэнт яшчэ адну вельмі важную ролю «Дажынак». «Тады крок за крокам, як бы ні было цяжка, мы кожны год мянялі сталіцу свята, змяняючы раённыя і абласныя цэнтры, — нагадаў ён. — Фестываль стаў нацыянальным праектам. Потым гэта трансфармавалася ў маштабную дзяржаўную праграму. Былі пабудаваны аграгарадкі і сучасныя малочнатаварныя і іншыя комплексы. Па сутнасці, адраджэнне вёскі пачалося з нашых «Дажынак».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што мы шмат самі сябе крытыкуем, і гэта, па яго меркаванні, правільна. Аднак, калі паглядзець праўдзе ў вочы, у нас ёсць чым ганарыцца. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы нагадаў, з чаго ўсё пачыналася. З вялікай цяжкасцю беларусы збіралі 5—6 мільёнаў тон збожжа і лічылі, што гэта нядрана, а 7 мільёнаў увогуле з'яўляліся залімітавым вынікам.

«Сёння мы прыйшлі да таго, што 10 мільёнаў — норма, але мой падыход ведаеце, нам трэба ўсяго толькі 11—12 мільёнаў тон збожжа і ўсё, больш не трэба, — сарыентаваў на больш прадукцыйную працу аграрыяў беларускі лідар. — Будзем апрацоўваць іншыя прадукты, якія мы купляем. Вы бачыце, як мяняецца клімат».

## «ТОЛЬКІ БРЭСТЧЫНА МАГЛА Б ГОД КАРМІЦЬ УСЮ БЕЛАРУСЬ ХЛЕБАМ»

У гэтай сувязі вялікія надзеі краіна звязвае з Брэстчынай — адным з флагманаў беларускага аграпрамысловага комплексу. За чвэрць стагоддзя вытворчасць сельгаспрадукцыі ў гэтым рэгіёне вырасла больш як у два разы. «Толькі Брэстчына магла б год карміць усю Беларусь хлебам (намалочанага збожжа, па самых сціплых падліках, хапіла б на паўмільярда боханаў), — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. — І засталося б яшчэ на кашу, спірт, піва і камбікармы. Толькі адна Брэстчына».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што сёлета вобласць першай у краіне пачала і завяршыла жніво. І, як перад цырымоніяй ушанавання працаўнікоў вёскі кіраўніку дзяржавы далажыў губернатар Пётр Пархомчык, ужо азімыя на Брэстчыне пасеяны. «Дакладна, дысцыплінавана, арганізавана, засыпаўшы ў засекі амаль два мільёны тон збожжавых і зернебабовых, выйшаўшы на ўраджайнасць звыш 38 цэнтнераў на круг, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Аб гаспадарках-перадавіках, якія сабралі з гектара больш за 70 цэнтнераў, асобных механізатарах-рэкардсменах не кажу. Яны самі за сябе сказалі ўдарнай працай. І вы ўбачыце на сцэне ўсіх герояў бітвы за ўраджай».

Але перад тым, як уручыць аграрыям заслужаныя ўзнагароды, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што вёска — гэта не толькі збожжавыя. Па яго словах, менавіта Брэстчына здзейсніла сапраўдны прарыў у Заўсёды — лідары раёна. Але самае галоўнае — яны пастаянна прыдумляюць нешта новае».

Прэзідэнт удакладніў, што ААТ «Парахонскае» з'яўляецца не толькі лідарам раёна, але і ў цэлым па краіне: гаспадарка ўваходзіць у тройку найлепшых. А самае каштоўнае для кіраўніка дзяржавы, што ў ААТ «Парахонскае» выбудавана сістэма, якая працуе больш як на 20 тысячах гектараў грамадскіх земляў. «Спачатку зрабілі цэх па выпуску брыкетаў, потым лінію раслліннага алею, затым сталі выраблядь камбікорм, а ўчора мне з гонарам дэманстравалі мінеральна-вітамінныя травяныя гранулы, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Што радуе мяне ў гэтым плане, у краіне пачынаюць капіраваць вопыт «Парахонскага».



Фота БелТА.

садоўніцтве. Ды яшчэ і з акцэнтам на імпартазамяшчэнне. 60 працэнтаў айчынных яблыкаў — з гэтага рэгіёна. Раннія агуркі з Пінска і са Століна, па словах Прэзідэнта, ведаюць не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце. «Ягады — клубніцы, маліны, буякі, журавіны — першымі ў краіне ў прамысловых маштабах таксама сталі вырошчваць менавіта тут, — канстатаваў беларускі лідар. — Усёй Беларусі прыклад паказалі. Досведам і саджанцамі падзяліліся. Цяпер восць узяліся за цюльпаны. Справа добрая».

Прэзідэнт заўважыў, што да канца года Брэстчына ўпершыню ў сваёй аграрнай гісторыі перасягне планку па надоях малака за 7,5 тысячы кілаграмаў ад каровы. «Гэта працэнтаў на 20 больш, чым у сярэднім па краіне, — падкрэсліў ён. — Раней думалі, што такое немагчыма. А цяпер гэта рэальнасць».

Адштурхоўваючыся ад дасягнутага, Прэзідэнт перакананы, што можна будаваць новыя планы, і агучыў добра вядомае: малако ў каровы на языку. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што нарыхтоўка кармоў не менш важная справа, чым уборка ўраджаю. Чатыры ўкосы для брастаўчан — звыклая практыка. Таму галоўнае, аб чым папрасіў Прэзідэнт, — ні ў якім выпадку не спыняцца, не зніжаць тэмпы і скакаць заўсёды вышэй планкі.

## «МЫ АДРАДЗІЦЬ ПАВІННЫ ПАЛЕССЕ НА ПРАЦЯГУ НАСТУПНАЙ ПЯЦІГОДКІ»

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што напярэдадні яму паказвалі адну з найлепшых гаспадарак рэгіёна — ААТ «Парахонскае», дзе ад кожнай каровы дояць ужо звыш 10 тысяч тон малака. Прэзідэнт прызнаўся, што назірае за гаспадаркай ужо больш як 20 гадоў — з таго часу, як упершыню пабываў там у 2004 годзе. «З радасцю бачу, што год за годам у іх стабільна растуць надоі, прывагі, ураджайнасць збожжавых, кукурузы, рапсу, рэнтабельнасць і прыбытак, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. —

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што кармавая база — збожжа і трава — у гаспадаркі свая. «Поўны цыкл, ажно да насенняводства, — заўважыў Прэзідэнт. — І пчолы ў іх таксама ёсць: без іх куды?! З такіх — прадпрымальных, упартых, хто з розумам выкарыстоўвае кожны кавалак зямлі, — нам трэба браць прыклад».

## «ТРЭБА НАШАМУ ПАКАЛЕННЮ ПАКІНУЦЬ ТОЕ, ШТО БУДЗЕ ПАТРЭБНА НАШЫМ ДЗЕЦЯМ»

Аляксандр Лукашэнка паўтарыў рашэнне, прынятае напярэдадні падчас наведвання ААТ «Парахонскае»: дзяржава вяртаецца да праграмы адраджэння Палесся. «Нічога звышнатуральнага я ад вас не патрабую, — заўважыў ён. — Трэба працягнуць тую вялікую справу, якую мы пачалі больш як дзясятак гадоў таму. Я ўчора, можа быць, занадта рэзка, жорстка сказаў, што Палессе можа накарміць краіну. Усё астатняе мы можам прадаць за межы Беларусі. Попыт на харчаванне будзе толькі расці. Простая формула: у свеце расце колькасць насельніцтва, а яго трэба карміць. Значыць, попыт на харчаванне будзе».

Палессе, па меркаванні Прэзідэнта, павінна адрадзіцца. «Гэта найпрыгажэйшы край Беларусі, — падкрэсліў ён. — Не ў крыўду іншым, як я кажу, тут сапраўдны беларус нарадзіўся са сваёй ментальнасцю, са сваім характарам, мэтанакіраванасцю, нейкай хітрынкай — сапраўдныя працаўнікі. І яшчэ раз падкрэсліваю: мы адрадзіць павінны Палессе на працягу наступнай пяцігодкі».

Гэта, па словах кіраўніка дзяржавы, яшчэ важна і таму, каб паказаць прыклад нашай моладзі. Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў, што нашым дзецям і ўнукам трэба паказаць, як трэба працаваць. «Як бы мы ні хвалілі моладзь, мы павінны гэта шчыра казаць (яна харошая, яна добрая, яна цудоўная, яна лепшая за нас), але яна іншая, — патлумачыў ён. — Нам трэба ім пакінуць той шлях, па якім яны хаця б у пачатку 10—20 гадоў павінны ісці, каб самім вызначыцца, як рухацца далей. Таму трэба цяпер нам, нашаму пакаленню, пакінуць тое, што будзе патрэбна нашым дзецям».

## «НАША АГУЛЬНАЯ ЗАДАЧА — ЗАХАВАЦЬ АДВАЯВАНАЕ Ў ПРЫРОДЫ»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што зямля — галоўны рэсурс аграрыя. «На Брэстчыне звыш паловы ўсіх сельгасугоддзяў атрыманы дзякуючы меліярацыі, — нагадаў ён. — У «Парахонскім», дарэчы, 80 %. Яшчэ ў савецкія часы для рэгіёна была распрацавана спецыяльная праграма».

Новая падобная праграма, па словах кіраўніка дзяржавы, будзе рэалізавана на больш высокім узроўні. «Нам можна зрабіць Палессе, як ужо сказаў, квітнеючым краем», — заўважыў Прэзідэнт. І нічога, па яго словах, выдумляць не трэба. Варта паўтарыць вопыт ААТ «Парахонскае», якое паспяхова вядзе сельскагаспадарчую дзейнасць на меліяраваных землях.

«Трэба проста паўтарыць адзін у адзін», — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што адпаведныя распараджэнні былі аддадзены напярэдадні вечарам. Адна з гаспадарак краіны, па словах Прэзідэнта, у будучым годзе паўторыць гэты поспех. Адказным за праграму адраджэння Палесся, як нагадаў Аляксандр Лукашэнка, прызначаны ўпаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Брэсцкай вобласці Міхаіл Русы, які, дарэчы, нарадзіўся на Палессі. Дапамагаць яму ў арганізацыйным і рэкамендацыйным плане будзе кіраўнік ААТ «Парахонскае» Уладзімір Храленка, які будзе назіраць за тэхналогіямі і патрабаваць тое, што зроблена ў яго гаспадарцы.

«Мы сканцэнтруем грашовыя рэсурсы на асноўных праграмах, не распыляючы па краіне, і будзем рэалізоўваць такія праграмы, як тут, на Палессі, — канкрэтызаваў планы Прэзідэнт. — Мы гэту маштабную работу будзем працягваць. Наша агульная задача — захаваць адваяванае ў прыроды».

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў свой час меліярацыю ажыццявілі. «Як толькі спыніліся, як толькі па-сапраўднаму перасталі працаваць, проста ажыццяўляць догляд меліярацыйных сістэм і каналаў, прырода імгненна ўсё пачала забіраць назад, — падкрэсліў ён. — Ідзе бітва, філасофская бітва, паміж чалавекам і прыродай. Чалавек змагаецца для таго, каб выжыць, для таго, каб жыць годна. Мы павінны гэта рабіць акуратна, не парушаючы асноўныя прынцыпы і законы светаўладкавання і суіснавання. З прыродай трэба быць на «Вы». Мы гэта ўмеем рабіць, асабліва на Палессі». Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што палешукі ўмеюць берагчы прыроду, бо яна заўсёды іх карміла і за кошт гэтай прыроды яны выжывалі.

## «ВЫ — ГЕРОІ. ЧАС ВЫБРАЎ ВАС»

Усё гэта, па словах беларускага лідара, абавязкова трэба зрабіць для дзяцей і ўнукаў, каб яны таксама працавалі на роднай зямлі. «І праз 10, 20, 50 гадоў гэтак жа, як і мы сёння, выходзілі б на сцэну «Дажынак», ганарыліся б сваёй крайнай, успамінаючы нас добрым словам», — лічыць Прэзідэнт.

Ен заўважыў, што 30 гадоў таму беларусы маглі толькі марыць аб сённяшнім узроўні нашага аграрнага сектара і дастойных умовах жыцця ў вёсцы. «Але мы гэта зрабілі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Не скажу, што ўсё зрабілі. Пытанні ёсць, але ў нас вялізны патэнцыял, у нас ёсць над чым узводзіць нашы будынкі жыцця».

Звяртаючыся да вяскоўцаў, Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што іх найлепшыя паказчыкі яшчэ наперадзе. Ен як ніхто ведае, як цяжка выйсці на рэкорд, захаваць і перасягнуць яго яшчэ цяжэй, асабліва ў гэтай справе. Аляксандр Лукашэнка перакананы, што і брастаўчанам, і новаму кіраўніку вобласці не пазычаць ведаў, досведу і амбіцый. «Рэгіён павінен у найбліжэйшыя гады ўстойліва выйсці на 2,5 мільёна збожжавых і зернебабовых, — паставіў задачу Прэзідэнт. — Вы, верагодна, заўважылі, што я, напэўна, упершыню ў сваім жыцці прамыслоўца накіраваў у ваш, можна сказаць, аграрна-прамысловы край. Гэта (Пётр Пархомчык. — **«Зв.»**) адзін з найлепшых кіраўнікоў нашага БелАЗа, які павінен даць дыханне не толькі сельскай гаспадарцы, але і перш за ўсё прамысловасці, якая ў нас крыху адстае на Брэстчыне».

Праграму развіцця прамысловага сектара вобласці, па словах кіраўніка дзяржавы, губернатар падрыхтаваў. У найбліжэйшы час разгледзяць. «Падтрымаем, калі яна будзе разумная, бо без прамысловасці не будзе і сельскай гаспадаркі», — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што верыць у брастаўчан, спадзяецца на іх, заўсёды рады іх поспехам, гатовы і далей ісці разам з імі да новых вышынь і ў эканоміцы, і ў сацыяльным жыцці. Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз выказаў удзячнасць усім кіраўнікам, камбайнерам, аграномам, механізатарам, вадзіцелям за хлеб і гераічную працу. Асаблівыя словы падзякі прагучалі ў адрас іх родных і блізкіх, якія кожны год у самы гарачы сезон падтрымліваюць, дапамагаюць і акружаюць аграрыяў клопатам.

«Жадаю ўсім вам самага галоўнага — здароўя, мірнага неба (цяпер гэта вельмі актуальна, і вы больш, чым хто-небудзь, гэта ведаеце), шчасця, сямейнага дабрабыту, вялікіх поспехаў у вашым нялёгкім жыцці і працы, — сказаў Прэзідэнт. — Вы вельмі патрэбныя вашай рабоце. Шчасця вашым дзеткам, каб яны вас не засмучалі, каб яны заўсёды сустракалі вас у позні перыяд жніва і радавалі вас сваімі жыццёвымі поспехамі. Вы, сапраўды, сёння героі нашага дня. Вы — героі. Усё проста: час выбраў вас».

## ГЕРОІ ЖНІВА

І гэтыя героі — пераможцы сёлетняй уборачнай кампаніі — атрымалі з рук кіраўніка дзяржавы заслужаныя ўзнагароды і памятныя падарункі.

Ордэна Працоўнай Славы ўдастоены калектыў ААТ «Парахонскае» Пінскага раёна. Ордэн Пашаны з рук Прэзідэнта атрымалі галоўны аграном ААТ «Агра-Кобрынскае» Кобрынскага раёна Іван Гусак і трактарыст-машыніст ААТ «Косава» Івацэвіцкага раёна Уладзімір Харужы.

Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці ААТ «Жураўлінае» Пружанскага раёна Аляксандр Баран, кіроўца аўтамабіля ААТ «Дварэцкі» Лунінецкага раёна Уладзімір

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ВЫ — АПОРА НАШАЙ КРАІНЫ»

Кіндрук, дырэктар ААТ «Вазнясенскі» Жабінкаўскага раёна Надзея Кандрацюк, аператар машыннага даення УП «Маладава-Агра» Іванаўскага раёна Валянціна Мокіч і трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці ААТ «Жарабковічы» Ляхавіцкага раёна Анатоль Петух.

Ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь» прысвоена старшыні СВК «Дарапеевічы» Маларыцкага раёна Васілю Юхімуку. Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь атрымалі старшыня СВК «Фядорскі» Столінскага раёна Мікалай Агафонаў, кіраўнік аддзялення «Зводы» ААТ «Астрамечава» Брэсцкага раёна Фёдар Вабішчэвіч, трактарыст-машыніст ААТ «Агра-Моталь» Іванаўскага раёна Руслан Супрун і кіроўца аўтамабіля аддзялення «Расна» ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна Сцяпан Царук.

За значны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў падзяка Прэзідэнта аб'яўлена калектыву супрацоўнікаў ААТ «Агра-Калядзічы» Пружанскага раёна, якому Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў падарункавы сертыфікат на трактар «Беларус».

## «НАМ ТРЭБА ВЫСТАЯЦЬ, КАБ НАША БЕЛАРУСЬ ЧАРГОВЫ РАЗ НЕ СТАЛА ПОЛЕМ БІТВЫ»

Пасля цырымоніі ўзнагароджання кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта толькі пачатак. Ён будзе вельмі рады выканаць свой канстытуцыйны абавязак, шмат разоў уручаючы гэтыя вялікія дзяржаўныя ўзнагароды нашым найлепшым даяркам, механізатарам, аграномам, інжынерам, заатэхнікам, ветурачам і, самае галоўнае, кіраўнікам, якія, на думку беларускага лідара, з'яўляюцца гераічнымі людзьмі. «Перакананы, што гэта толькі пачатак, — дапоўніў Аляксандр Лукашэнка. — Мы пасля заканчэння пяцігодкі павінны адзначыць самымі высокімі ўзнагародамі найлепшых — тых, хто аддаваў сябе, не шкадуючы сваёй працы (ну, што там казаць, і жыцця), не звяртаючы ўвагі, як жыве, дзе жыве». Прэзідэнт добра ведае, што такое праца аграрыя і што такое праца кіраўніка.

Беларускі лідар падкрэсліў, што час цяпер вельмі няпросты. У сувязі з гэтым ён звярнуўся да аграрыяў, а таксама прысутных на свяце з вялікай просьбай, якую, па словах Прэзідэнта, трэба вырашыць усім разам. І гэта, безумоўна, не датычыцца тых, хто сабраўся на плошчы ў Мікашэвічах. «Але давайце шчыра прызнаем: усе такія ў Беларусі? Не. Тысячы і тысячы лайдачаць, — агучыў праблему Аляксандр Лукашэнка. — Вядома, я зраблю для сваёй краіны ўсё, каб прыцягнуць іх да высакароднай працы. Не толькі сялянскай».

Дапамагчы ў гэтым кіраўніку дзяржавы, па яго словах, павінны аграрыі. «Мы ж працаўнікі, беларусы заўсёды былі працаўнікамі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І нядобра, калі мільёны людзей працуюць, а дзесяці тысячы сноўдаюцца без справы. Нам трэба вырашыць гэтую праблему».

Акрамя таго, Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што падтрымка сельскіх жыхароў будзе працягвацца. І гэта датычыцца не толькі жылля. Па словах кіраўніка дзяржавы, праграма жыллёвага будаўніцтва будзе пераарыентавана на вытворчасць: дамы і сацыяльныя аб'екты будуць узводзіцца перш за ўсё там, дзе будуць ствараца вытворчыя магутнасці. Датычыцца гэта і сельскай гаспадаркі.

Кажучы аб сацыяльных аб'ектах, Прэзідэнт звярнуў увагу, што іх не трэба будаваць, іх дастаткова ўтрымліваць у належным стане. «Мы ўжо ўсё пабудавалі, трэба ўсім беларусам даць кутох для жылля, — агучыў прыярытэты кіраўнік дзяржавы. — Мы гэта зробім».

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім моцнага здароўя, здароўя дзецям. «Я ведаю, што такое дзеці, яны не павінны вас заклапочваць, — лічыць ён. — Калі дома парадак, то і ў полі будзе нармальна. І на заводзе, на фабрыцы. І ў сацыяльных аб'ектах, і ў дзяржаўных установах будзе парадак. Усе мы страшна залежныя ад дзяцей».

Прэзідэнт пажадаў, каб яны атрымалі ў спадчыну ад сваіх бацькоў толькі самае лепшае, пайшлі іх шляхам. «Я заўсёды кажу: дзеці нашы, і мы нідзе нікому не патрэбны, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Толькі там, дзе мы нарадзіліся. Трымайцеся сваіх каранёў. Вы жывяце ў цудоўным горадзе. Мы ж нямала з вамі зрабілі для таго, каб такі быў квітнеючы гарадок, аграгарадок».

Па словах кіраўніка дзяржавы, на працягу наступнай пяцігодкі ўсе дарогі да аграгарадкоў будуць мадэрнізаваны і адноўлены. «Не будзе ні адной дрэннай дарогі, — паабяцаў ён. — Мы пачалі ўжо гэту праграму. Я гэта кажу таму, бо вы не горш, чым я, а многія лепш, чым я, адчуваеце і разумееце, што лепш працаваць на роднай мірнай зямлі. Нам патрэбен мір. Нам больш нічога не трэба. Усё астатняе мы зробім, як заўсёды было, сваімі рукамі. Але нам трэба выстаяць, каб наша Беларусь чарговы раз не стала полем бітвы моцных свету ўсяго. На гэта мы будзем накіраваны. Гэтага вы хочаце, яшчэ больш гэтага хачу я».

Прэзідэнт заклікаў палешукоў жыць дружна, мірна, не крыўдзіць ні ўкраінцаў, ні расіян, якія прыязджаюць у Беларусь з дабром. «Беражыце гэты мір — міжрэлігійны, міжнацыянальны мір, ён нам дорага дастаўся, — падкрэсліў беларускі лідар. — Зямлі для ўсіх хопіць. Прыезджая да нас не просяць кавалак хлеба, а калі і просяць, то толькі ў пачатку. Затым яны працуюць і зарабляюць самі. Нам патрэбны на гэтай зямлі працоўныя рукі. Шчасця вам і дабра».

## «ПАСТАЎЛЕНАЯ ЗАДАЧА ПРЫМАЕЦЦА ДА ВЫКАНАННЯ»

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр Пархомчык ад хлебаробаў Брэстчыны ўручыў кіраўніку дзяржавы каравай. Губернатар паведаміў, што вобласць завяршае пасяўную работу ўраджаю 2025 года азімых культур. Што датычыцца ўборачнай кампаніі гэтага года, то, па словах кіраўніка рэгіёна, яна на фінішнай прамой. «Агульны валавы вынік 2024 года па збожжавых, зернебабовых культурах, грэчцы, просе, рапсе перавысіў 2 мільёны тон, — далажыў ён. — У Брэсцкай вобласці асабліва ставяцца да даручэнняў Прэзідэнта нашай краіны, і пастаўленая задача — дасягнуць выніку ў 2,5 мільёна тон — прымаецца да выканання».

Пётр Пархомчык падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за цеплыню і клопат, які кіраўнік дзяржавы заўсёды аказвае аграрыям. Акрамя таго, у якасці падарунка Прэзідэнту перадалі кнігу і дакументы на двух коней палескай папуляцыі. У кнізе адлюстравана гісторыя і характарыстыка коней палескай папуляцыі, кароткая інфармацыя пра жарабя Банціка і кабылку Гаваруху, падораных кіраўніку дзяржавы. Коні прадстаўляюць старажытную папуляцыю, якая стагоддзямі фарміравалася на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся. Палескі конь валодае фенаменальнай устойлівасцю да неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя. Акрамя таго, ён нясе ў сабе генетычны матэрыял лясных тарпанаў, апошні табун якіх у дзікай прыродзе быў знішчаны ў 1879 годзе.

Падзякаваўшы за падарунак, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што да жывёл у яго асаблівае стаўленне і палескія коні зоймуць добрае месца на прэзідэнцкім гаспадарчым двары.

Пасля цырымоніі ўшанавання аграрыяў Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з выстаўкай «Першы ў #1рэгіёне», дзе на адным з планшэтаў пакінуў свой аўтограф. Свята працягнулася канцэртнай праграмай творчых калектываў Брэсцкай вобласці.

*г. Мікашэвічы.*

## ❍ У тэму

**Дзмітрый КРУТОЙ:**

### «Адраджэнне Палесся стане нацыянальным праектам Беларусі»

Як адзначыў у размове з журналістамі **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ,** Брэстчына паказвае выдатныя вынікі не толькі сёлета, але і на працягу многіх гадоў. «Гэта вынік з'яўлення новых кампаній у сферы перапрацоўкі, — заўважыў ён. — Пад гэта, зразумела, падцягваецца і сыравінная база, больш паспяхова выкарыстоўваюцца зямельныя рэсурсы. Мы бачым на працягу апошніх трох-чатырох гадоў маштабныя ўкладанні ў праект па меліярацыі. Усё-такі больш за палову меліяраваных земляў у нашай краіне — гэта Брэсцкая вобласць».

Па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, ужо фактычна створана каманда, якая будзе рэалізоўваць праграму па адраджэнні Палесся, — яна стане нацыянальным праектам Беларусі. У найбліжэйшы час ва ўрадзе вызначаць раёны, якія будуць у праграме ўдзельнічаць, асноўныя мерапрыемствы і схемы фінансавання. Найбольш вялікія ўкладанні найбліжэйшыя пяць гадоў чакаюць менавіта Брэсцкую вобласць.

Дзяржаўная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся была рэалізавана ў 2010—2015 гадах. Аднак яе вынікі былі не такімі, як чакалася. «Прэзідэнт, калі прааналізаваў выніковыя лічбы, прыйшоў да высновы, што гэта было звязана з распыленнем рэсурсаў, — растлумачыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — На яго думку, трэба было канцэнтраваць рэсурсы на сярэдніх і моцных прадпрыемствах: гэта прынесла б больш эфект. Таму ў рамках новай праграмы Прэзідэнт даручыў, каб яна не была аб'ёмнай, доўгай, незразумелай, каб былі вызначаны канкрэтныя ўдзельнікі і канкрэтныя мерапрыемствы».

У прыватнасці, у Магілёўскай вобласці на базе трох раёнаў запланаваны эксперымент, калі ў раёне застанецца літаральна тры-чатыры буйныя гаспадаркі, вакол якіх будуць сканцэнтраваны і ўся вытворчая база, і кадравая база. «Але нельга аднамомантна гэта маштабаваць на ўсю краіну: у кожнай вобласці на прыкладзе некалькіх раёнаў мы паглядзім, што з гэтага атрымаецца», — падкрэсліў Дзмітрый Крутой.

Ён звярнуў увагу, што ў апошнія дзесяцігоддзе шмат людзей з'ехала з сельскай мясцовасці. Нягледзячы на гэта, сельскагаспадарчая галіна прырасла фактычна ў два разы, што, безумоўна, звязана з тым ліку з механізацыяй сельскай гаспадаркі. «Гэта данасць, яе трэба прыняць такой, якая яна ёсць, і з меншай колькасцю рэсурсаў дабівацца больш сур'ёзнага выніку, — заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — І гэта ў гаспадарак-маякоў з'яўляецца. Напэўна, альтэрнатывы ўзбуйненню і разумнаму дафінансаванню з боку дзяржавы гэтых новых інтэгратараў няма. І гэтая мадэль паступова будзе павялічвацца ў маштабах краіны і, напэўна, праз пяць-дзесяць гадоў стане асноўнай нашай аграрнай палітыкі».

**Пётр ПАРХОМЧЫК:**

### «Важна навучыцца дакладна прытрымлівацца тэхналогій»

**Старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Пётр ПАРХОМЧЫК** назваў ключавым момантам у рабоце выкананне дысцыпліны, аб чым часта гаворыць Прэзідэнт. «Усе працэсы вядомыя і зразумелыя, але навучыцца дакладна прытрымлівацца тэхналогій — вось што сапраўды важна», — канкрэтызаваў губернатар.

Пётр Пархомчык звярнуў увагу на дзяржаўную падтрымку, аказаную Брэстчыне: рэгіён атрымаў комплекс угнаенняў, што дасць магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць рэсурсы і павялічыць вытворчыя магчымасці. Важным укладам сталі таксама намаганні прамыслоўцаў, якія падарылі неабходную для агарпрамысловага сектара тэхніку і абсталяванне.

Па словах губернатара, Прэзідэнт паставіў задачу навесці парадак у сферы меліярацыі. Брэсцкая вобласць актыўна працуе над мадэрнізацыяй сістэм арашэння. Напрыклад, новыя метады паліву пачалі выкарыстоўваць у Парахонску, што дае магчымасць забяспечыць неабходную вільгаць нават у складаных умовах. Як падкрэсліў старшыня Брэсцкага аблвыканкама, важна працягваць цэнтралізаваную работу ў гэтым кірунку. Развіваць, па яго словах, плануецца і агародніцтва — каб Брэсцкая вобласць і далей заставалася лідарам у краіне па вырошчванні гародніны.

### «Гэта не толькі мая ўзнагарода...»

Карэспандэнты пагутарылі з аграрыямі, якія атрымалі з рук кіраўніка дзяржавы высокія дзяржаўныя ўзнагароды.

Калектыў ААТ «Парахонскае» Пінскага раёна ўдастоены ордэна Працоўнай Славы. У **кіраўніка сельскагаспадарчага прадпрыемства Уладзіміра ХРАЛЕНКІ** спыталі, у чым сакрэт паспяховасці. Ён адказаў: сакрэт у тым, каб жыць і працаваць на зямлі. «Палешукі — асаблівы народ: ім заўсёды хочацца большага, — заўважыў ён. — А гэта галоўнае. Хочаш зарабіць — працуй. Таму сакрэт — у жаданні жыць і працаваць на той зямлі, дзе ты нарадзіўся».

Сам дырэктар ААТ «Парахонскае» — з Бранскай вобласці. 40 гадоў таму прыехаў у Беларусь, якая стала для яго другой Радзімай. «Тут нарадзіліся мае дзеці, тут растуць мае ўнукі», — сказаў ён.

Уладзімір Храленка ўдзячны, што Аляксандр Лукашэнка адзначыў работу сельгаспрадпрыемства высокай узнагародай. «Планы Прэзідэнт вызначыў сур'ёзныя, але яны выканальныя, — паведаміў ён. — Працягваем рухацца наперад. Мяжы немагчымаму няма. І гэта наша прадпрыемства ўжо паказвае на працягу многіх гадоў. Калі раней мы прадавалі 15—20 тон малака ў дзень, цяпер — 150. Як сказаў Прэзідэнт, харчаванне заўсёды ў цане, у трэндзе, а есці любяць усе, і не адзін раз на дзень. Не спыняцца — гэта самае галоўнае. Тэхналогіі ўдасканальваюцца, мы павінны быць на вастрыі».

**Трактарыст-машыніст ААТ «Косава» Івацэвіцкага раёна Уладзімір ХАРУЖЫ** ніколі не думаў, што будзе ўдастоены высокай узнагароды — ордэна Пашаны. У свой час як скончыў курсы трактарыста ў 1963 годзе, так і працягвае працу, нягледзячы на статус пенсіянера. Па яго шляху пайшлі два сыны і ўнук. Агульны працоўны стаж дынастыі — 117 гадоў. «Я шчаслівы і вельмі рады», — падзяліўся ён пасля цырымоніі ўзнагароджання.

Сімвалічна, што медаль «За працоўныя заслугі» **дырэктар ААТ «Вазнясенскі» Жабінкаўскага раёна Надзея КАНДРАЦЮК** атрымала ў дзень свайго нараджэння. Найлепшага падарунка і прыдумаць нельга. Цікавімся, ці не складана жанчыне кіраваць гаспадаркай. «У мяне характар такі — устойлівы, мужны, — кажа яна. — Прыйшоўшы ў сельскую гаспадарку, я не думала аб тым, жанчына я або мужчына. Разумела, што за мной стаіць каманда і я павінна весці яе наперад. Ствараючы добрыя ўмовы для працаўнікоў, асвойваючы новыя тэхналогіі, мы і прыйшлі да медаля. Гэта не толькі мая ўзнагарода: яна саткана з працы ўсёй нашай каманды».

Свой працоўны шлях Надзея Кандрацюк пачынала ў гэтай жа гаспадарцы: дваццаць гадоў адпрацавала тут эканамістам. Затым набіралася вопыту ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі Жабінкаўскага райвыканкама, пасля чаго вярнулася ў ААТ «Вазнясенскі» дырэктарам.

*Лунінецкі раён.*

**Вераніка КАНЮТА.**

# СПРАВА ЎПАКОЎКІ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле яго слоў, цяпер прадпрыемства можа поўнасцю задаволіць патрэбы айчынных мясакамбінатаў ва ўпакоўцы і палепшыць лагістыку.

— Новы цэх дасць магчымасць павялічыць аб'ёмы з гафрыраванай прадукцыі на 30 %, а таксама развіць у далейшым нашу асноўную вытворчасць. Наша кампанія штогод праводзіць мадэрнізацыі, пашырае парк абсталявання. І на сёння мы з'яўляемся тэхналагічнымі лідарамі галіны па сваіх прадуктах, — дапоўніў дырэктар прадпрыемства.

У сваю чаргу старшыня Мінскага райвыканкама Уладзімір Юргевіч адзначыў, што фінансаванне ажыццяўлялася з выдзяленнем дзяржаўнай падтрымкі ў выглядзе льготнага крэдыту на суму 7 млн рублёў. Таксама для яго рэалізацыі падалі зямельны ўчастак.

— Гэта прадпрыемства ў нас стабільна развіваецца. Яно ўваходзіць у дзясятку найлепшых прамысловых прадпрыемстваў па гадавым аб'ёме вытворчасці прадукцыі. За 2023 год гэтая лічба склала больш за 135 млн рублёў. З уводам новага цэха гафрацыі і ўпакоўкі, вядома, гэтая сума будзе павялічвацца. А з нашага боку заўсёды будзе падтрымка для рэалізацыі новых ідэй, выдзялення зямельных плошчаў і крэдытных рэсурсаў, — падзяліўся ён.

У чым жа перавага гафрыравання?

— Галіна мясаперапрацоўкі ў Беларусі і ўсе нашы заводы ўжо аснашчаны самым сучасным абсталяваннем па вытворчасці каўбас, і выкарыстоўваць абалонку ў рулонным выглядзе з яе патрэбай у ручной працы ўжо проста немагчыма, — растлумачыў Юрый Казлоў. — Рулонную абалонку трэба змясціць у тазік з вадой, замачыць, вытрымаць. У выпадку з гафрыраваннем яна аўтаматычна ўкладваецца і дазваляе вельмі хутка вырабляць мясныя прадукты.

Варта адзначыць і тое, што новы цэх стварыў дадаткова 20 працоўных месцаў. Па словах Юрыя Казлова, у кантэксце далейшых планаў па мадэрнізацыі прадпрыемства гэта далёка не мяжа. Так, у найбліжэйшыя пяць гадоў яны плануюць павялічыць штат яшчэ ад 50 да 100 супрацоўнікаў. Дарэчы, падрыхтоўка і навучанне аднаго спецыяліста займае каля года.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

Надвор'е

# ДОЖДЖ АДСТУПІЦЬ, І ПАЦЯПЛЕЕ

## Але моцны парывісты вецер...

**Як адзначылі ў Белгідрамеце, халодная восень вырашыла да нас не вельмі спяшацца і прапусціць наперад бабіна лета — у сярэдзіне тыдня на захадзе краіны чакаецца пацяпленне да 22 градусаў. Дарэчы, ужо з аўторка сінаптычная сітуацыя пачне мяняцца. Паказанні барометраў стануць расці, улада над надвор'ем пяройдзе да вобласці павышанага атмасфернага ціску, якая стане перашкодай для франтальных раздзелаў, а значыць, ападкі ў большасці раёнаў спыняцца, лічаць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. На жаль, дыскамфорту будзе дадаваць моцны парывісты вецер.**

У аўторак умовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць у асноўным вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі ноччу па ўсходняй палове краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу. Чакаецца воблачнае, днём з праясненнямі надвор'е. Ноччу і раніцай у асноўным па ўсходняй палове краіны пройдуць дажджы, днём пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі будзе згушчацца туман. Вецер уначы паўночна-заходні, удзень няўстойлівы ад слабага да ўмеранага, на ўсходзе месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы 3—9 цяпла, максімальная днём ад 9 да 15 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах Беларусі складзе 16—18 градусаў. Атмасферны ціск будзе слаба расці.

Ужо ў сераду ўмовы надвор'я будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, у дзённыя гадзіны ў заходніх раёнах краіны адаб'ецца ўплыў цёплых паветраных мас, якія распаўсюджваюцца да нас з поўдня Еўропы. Воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны, удзень парывісты, у асобных раёнах на паўночным захадзе моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы 1—8 цяпла, па захадзе краіны да плюс 12 градусаў, па ўсходзе краіны пры праясненнях чакаюцца замаразкі да мінус 2 градусаў. Аднак днём прыгрэе: ад 11 цяпла па паўночным усходзе да плюс 22 градусаў па захадзе краіны.

У чацвер пацяплее і ноччу. У гэтыя суткі надвор'е ў асноўным працягне вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі ноччу па паўночна-заходняй палове краіны адаб'ецца ўплыў малаактыўнага атмасфернага фронту. Воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў, толькі ўначы месцамі па паўночна-заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы ўжо 6—12 цяпла, а максімальная днём будзе ад 13 градусаў па паўночным усходзе да 22 цяпла па захадзе краіны.

Згодна з папярэднім прагнозам айчынных сіноптыкаў, да канца тыдня вобласць высокага ціску стане губляць свой уплыў на надвор'е, ціск пачне падаць, павялічыцца колькасць аблокаў, а франтальныя раздзелы прынясуць новыя порцыі дажджоў.

Ужо ў пятніцу 11 кастрычніка ноччу месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе дастаткова цёплай — 8—15 градусаў, а максімальная днём — 12—19 цяпла, а па паўднёвым усходзе краіны — да 22 градусаў.

У выхадныя да нас пачне вяртацца звычайная восень. У суботу ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы — 4—9 градусаў, па ўсходзе да 12, а максімальная днём — 9—15 цяпла.

У нядзелю 13 кастрычніка будзе пераважна без ападкаў, толькі ноччу месцамі па ўсходзе, а днём і па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы — 1—6 цяпла, месцамі да 9 градусаў, максімальная днём — 8—13 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Супрацоўніцтва

# Пакістанскі дом на Дзвіне

**У Віцебску адкрылі першы ў паўночным рэгіёне Пакістанскі культурна-адукацыйны цэнтр. Праект стаў вынікам плённага супрацоўніцтва Пасольства Ісламскай Рэспублікі ў Беларусі і Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта.**

У цэнтры прадстаўлена калекцыя кніг пра Пакістан, знакавыя творы мастацтва вядомых пакістанскіх мастакоў, захапляльныя фатаграфіі разнастайных ландшафтаў Пакістана, а таксама яркая калекцыя артэфактаў, якія адлюстроўваюць багатыя традыцыі пакістанскага мастацтва і рамёстваў.

Пасля цырымоніі адкрыцця праекта **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Рэспубліцы Беларусь Саджад Хайдэр ХАН** адзначыў, што гэта яго пяты візіт у культурную сталіцу і першы — у Віцебскі медуніверсітэт. «На сёння тут навучаюцца 16 студэнтаў з Пакістана, але ўпэўнены, што іх колькасць будзе расці, і дапаможа ў гэтым культурна-адукацыйны цэнтр, створаны пры падтрымцы Пасольства Пакістана ў Мінску і Віцебскага медуніверсітэта. Гэтая ВНУ адыгрывае важную ролю ў развіцці міжнароднай адукацыі, даючы магчымасць атрымаць вышэйшую медыцынскую адукацыю сотням замежных студэнтаў з самых розных куткоў свету. Знаходзячыся ўдалечыні ад дома, студэнты з Пакістана будуць наведваць цэнтр і змогуць адчуць атмасферу сваёй краіны. А беларускія студэнты пазнаёмяцца з традыцыямі Пакістана праз прадстаўленыя ў цэнтры экспанаты: творы мастацтва, фатаграфіі ландшафтаў. Гэта дапаможа стварыць станоўчы вобраз Пакістана, лепш зразумець яго культуру», — расказаў пасол.

Саджад Хайдэр Хан нагадаў, што з 2021 года Пасольства Пакістана актыўна ўдзельнічае ў фестывалі «Славянскі базар у Віцебску», што спрыяе ўмацаванню культурных сувязяў паміж дзвюма краінамі.



Фота «Віцьбічы».

**Рэктар Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта Аляксей ЧУКАНАЎ** падкрэсліў, што ВНУ запатрабавана сярод студэнтаў, у тым ліку замежных. «Для нас вельмі важнае супрацоўніцтва з замежнымі дзяржавамі, мы наладзілі трывалыя ўзаемасувязі з краінамі далёкай і блізкай дугі. Наша ВНУ нездарма ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў, прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, прыязджаючы сюды на вучобу, выбудоўваюць добрыя ўзаемаадносіны, фарміруюць правільнае ўяўленне аб Беларусі. Адкрыццё цэнтра — новая старонка супрацоўніцтва з Пакістанам, гэта дазволіць пакістанскім студэнтам адчуваць сябе як дома».

Рэктар высока ацаніў ініцыятыву пасольства па ўзаемадзеянні, выказаў гатоўнасць падтрымліваць далейшае супрацоўніцтва і запрасіў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла прыехаць на 90-годдзе медуніверсітэта, якое будуць святкаваць ужо ў лістападзе.

Пасля цырымоніі адкрыцця Саджад Хайдэр Хан правёў гадзінную сустрэчу са 150 студэнтамі, перад якімі ён выступіў з прэзентацыяй пра Пакістан.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Супрацоўнікі Сакрэтнай службы ЗША масава звальняюцца з-за перапрацовак



Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на газету The New York Times. Як адзначаецца, ведамства разумела, што 2024-ы стане для яго адным з самых напружаных за апошнія гады. Яго агентам трэба было працаваць на перадвыбарных мітынгах, палітычных з'ездах, саміце НАТА, а таксама мець справу з ростам пагроз для жыццяў палітычных лідараў. Аднак Сакрэтная служба падышла да гэтага перыяду негатовай. Замест павелічэння кадравага складу быў зафіксаваны найбуйнейшы адток персаналу як мінімум за апошнія 20 гадоў: у 2022-м і 2023-м фінансавых гадах звольніліся 1,4 тыс. з 7,8 тыс. супрацоўнікаў Сакрэтнай службы. Сярод прычын іх прашэнняў аб адстаўцы — частая звышурочная работа, якая магла нават не аплачвацца, фаварытызм і непатызм у арганізацыі. Як адзначае The New York Times, страта вялікай колькасці каштоўных супрацоўнікаў магла б быць не такой крытычнай, калі б у Сакрэтнай службы ў рэзерве былі людзі, гатовыя і здольныя заняць іх месцы. Аднак своечасова падрыхтаваць «лаву запасных» не ўдалося.

## У Конга выяўлена больш як 30 тысяч хворых на воспу малпаў



Больш як 30 тысяч выпадкаў захваральнасці на мрох (новае найменне воспы малпаў) выяўлена з пачатку года на тэрыторыі Дэмакратычнай Рэспублікі Конга (ДРК). Колькасць памерлых набліжаецца да тысячы. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на кангалезскі партал навін Actualite. Партал прыводзіць словы міністра аховы здароўя ДРК Самюэля Ражэ Камба, які сказаў: «Найбольш высокая смяротнасць ад мрох сярод дзяцей, на ўзроставую групу да пяці гадоў прыпадае 70 працэнтаў ад агульнай колькасці смяротных выпадкаў. Захварэлыя на мрох выяўлены ва ўсіх 26 правінцыях краіны». ДРК стала эпіцэнтрам цяперашняй успышкі мрох у Афрыцы. Усяго на кантыненце хворыя выяўлены ў 18 краінах, зафіксавана больш чым 35 тысяч выпадкаў захворвання.

## У Нотр-Даме завяршылі ўстаноўку ўсіх васьмі званоў

Работы па ўстаноўцы васьмі званоў, адпраўленых на рэстаўрацыю пасля буйнога пажару 2019 года, завяршыліся ў саборы Парыжскай Маці Божай (Нотр-Дам). Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на міністра культуры Францыі Рашыду Даці. Яна нагадала, што падчас пажару паўночная вежа пацярпела ад полымя, усе званы з яе былі адпраўлены на рэстаўрацыю. Усяго ў абедзвюх вежах Нотр-Дама дзесяць званоў. Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон у маі заявіў, што сабор Парыжскай Маці Божай адкрыецца для наведвальнікаў 8 снежня. Поўнае завяршэнне аднаўленчых работ у саборы намечана на 2029—2030 гады.



Наш фармат

# УРОКІ ГІСТОРЫІ Ў СТЫЛІ «РЭТРА»

## Намеснік кіраўніка сельгаспрадпрыемства аднаўляе старыя аўтамабілі і арганізоўвае патрыятычныя аўтапрабегі

**Аляксандр ЧАПЯЛЮК працуе намеснікам генеральнага дырэктара па будаўніцтве вядомага сельгаспрадпрыемства — ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна. А яшчэ Аляксандр Віктаравіч многія гады аднаўляе старыя машыны і матацыклы. І гэта ўжо не зусім хобі, а, хутчэй, другая справа жыцця.**



Мы гутарым ва ўтульнай, прасторнай альтанцы каля дома Аляксандра і Ганны Чапелюкоў, адкуль да гаража некалькі крокаў. Там стаіць яго чарговы, не, не праект, хутчэй, дзецішча, стымул. Але пра гэта крыху пазней... І ў ліку галоўных умоў поспеху сваёй справы Аляксандр называе разуменне і падтрымку жонкі. Сапраўды, яго хобі вельмі не таннае, грошы даводзіцца выдаткоўваць з сямейнага бюджэту. Таму выглядае надзвычай важным, што Ганна яго разумее, даводзіць сябе як сапраўдная сяброўка і паплечніца. Яна бывае побач з мужам на аўтапрабегах, іншых тэматычных мерапрыемствах, з задавальненнем прымае дома яго таварышаў па хобі, аднадумцаў. Такую справу ў адзіночку не здужаеш, у ваколіцах Брэста ёсць нямала людзей, якія захапляюцца гісторыяй і аднаўленнем старой тэхнікі. Яны ведаюць адно аднаго, сустракаюцца, абменьваюцца інфармацыяй, разам удзельнічаюць у мерапрыемствах.

— Пачыналася ўсё ў далёкія ўжо школьныя гады, — згадвае Аляксандр Віктаравіч. — Памятаю, як быў шчаслівы, калі ганяў на мапедзе. А ў 1991 годзе, калі ў краіне стала нестабільна і людзі думалі, як лепей выкарыстаць зберажэнні, бацька купіў мне «Мінскі» матацыкл. Гэта быў прыгажун абсалютна белага колеру. Ён і цяпер у вачах стаіць. Усе мае ўспаміны юнацтва, можна сказаць, звязаны з гэтым матацыклам. Ганну на ім вазіў, мы сустрэліся, калі мне было 18 гадоў, а ёй 16. Ну, відаць, мой белы «конь» зрабіў на яе ўражанне (***усміхаецца***), а потым, калі ўжо вучыўся ў інстытуце, аднойчы паехаў на рыбалку, і там матацыкл укралі... Да гэтай пары ў душы жыве сум па тым, першым, жалезным сябры і не пакідае надзея знайсці падобны экзэмпляр ды аднавіць яго. Аднойчы нават трапілася аб'ява аб продажы такога, дарэчы, зусім новага, але не паспеў: мяне апярэдзілі такія ж аматары старой тэхнікі.

— Думаю, што на маё захапленне паўплывалі дзіцячыя мары. Тады, вясковым хлопчыкам, я марыў і пра свой асабісты аўтамабіль... Тыя думкі, што недзе заселі ў падсвядомасці альбо нават у глыбіні душы, абярнуліся вось такім захапленнем — даваць другое жыццё даўнейшай тэхніцы. Калі заглыбляешся ў тэму, адкрываеш для сябе стольскі новага! Раней машыны рабілі даволі цікава. Несумненна, адрозніваюцца ад сучасных дызайн машын, інжынерныя падыходы, матэрыялы, з якіх выраблялі аўтамабілі, — працягвае аповед Аляксандр. — Гэта вельмі цікавая тэма, хто на яе падсеў, таго яна ўжо ніякім чынам не адпускае: праглядаеш літаратуру, знаходзіш і набываеш запчасткі, нават тыя, якія на сёння не патрэбны, з прыцэлам на запас, ледзь не штовечар завісаеш на адпаведных сайтах і каналах.

Цяпер у Аляксандра Чапелюка ёсць «Волга» 1974 года, два «Масквічы» 1967 і 1980 года, «Опель» 1938 года, «Трабант» часоў ГДР і яшчэ некалькі машын і матацыклаў. На кожную з машын фактычна пайшло па некалькі гадоў карпатлівай работы. Іншая — перабраная і перароблена да гайкі, таму ў пэўным сэнсе іх можна лічыць ужо яго аўтарскімі варыянтамі. Аляксандр Віктаравіч нават не разглядае магчымасці прадаваць нешта са сваіх аўто, усе трывала прапісаліся ў яго калекцыі.

«Опель» 1938 года выпуску да гэтай пары знаходзіцца ў рабоце, стаіць у гаражы Чапелюкоў. Па-першае, цяжка знайсці дэталі да такой машыны, а па-другое, нярэдка там патрабуецца літаральна ювелірная работа, даводзіцца і самому нешта выточваць і звяртацца да майстроў. Але ж калі ўзяўся, то справа гонару — давесці яе да канца.

Як і любому чалавеку, які займаецца аднаўленнем рэтратэхнікі, Аляксандру важна часам вывозіць свой аўтапарк у свет, паказваць машыны, чуць водгукі, адказваць на пытанні. «Усё гэта робіцца для папулярызацыі гісторыі, для нашых дзяцей, каб яны такім чынам маглі больш даведацца пра мінулае, — гаворыць энтузіяст сваёй справы. — Гістарычныя веды перадаюцца не толькі з дапамогай падручнікаў, кніг, фільмаў пра тую эпоху, але і праз рэчы, тэхніку, што тады была. І, як паказвае практыка, дзеці цікавяцца ранейшымі аўто, матацыкламі. Калі недзе вывозім, выстаўляем свае экзэмпляры, ад школьнікаў літаральна адбою няма, з задавальненнем залазяць, разглядаюць, круцяць, што можа круціцца».

Аўтамабілі Чапелюка ўжо паспелі паслужыць не толькі справе асветы маладога пакалення рэгіёна, але і расійскай кінематаграфіі. Два гады таму на здымках серыяла «ГДР» былі задзейнічаны тры машыны нашага героя — «Волга», «Масквіч» і «Трабант». Здымалі спачатку ў Гродне, потым у брэсцкім аэрапорце. «Нядаўна мы глядзелі гэты серыял, і было вельмі цікава сустрэцца са сваімі машынамі на экране, напрыклад, у кадры на нашым «Трабанце» рухаюцца нямецкія паліцэйскія», — гаворыць Ганна Паўлаўна.

А яшчэ Аляксандр Чапелюк стаў ініцыятарам патрыятычных аўтапрабегаў менавіта на рэтрамашынах. Такая калона заўсёды прыцягвае ўвагу, збіраецца нямала гледачоў, што вельмі важна для зместу і праграмы аўтапрабегаў. Сёлета прайшло ўжо трэцяе па ліку мерапрыемства. Іх ладзяць камянецкія аўтааматары да 9 Мая. Кожны раз распрацоўваецца спецыяльны маршрут, на якім абавязкова ёсць помнікі і памятныя мясціны. Каля тых абеліскаў прыпыняюцца ўдзельнікі, ускладваюць кветкі, хвілінай маўчання шануюць памяць. З кожным годам, дарэчы, удзельнікаў і машын становіцца болей. Сёлета на аўтапрабег у гонар Дня Перамогі выйшла калона з 30 машын. А пачалі мерапрыемства з невялікай выставы рэтратэхнікі ў Белавежскім. І, як заўсёды, сабралі шмат гледачоў. Затым праехалі па населеных пунктах сельгаспрадпрыемства «Белавежскі», зрабілі круг працягласцю каля 70 кіламетраў. Канечным пунктам маршруту стала вёска Воўчын, дзе побач з абеліскам на брацкай магіле воінаў-вызваліцеляў адбыўся невялікі мітынг з ускладаннем кветак. Ідэйна і матэрыяльна мерапрыемства падтрымала ААТ «Белавежскі», генеральны дырэктар Аляксандр Дунькович таксама далучыўся да аўтапрабегу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з архіва Аляксандра ЧАПЕЛЮКА.**

Акцыя

# У ПАДАРУНАК ГІМНАЗІСТАМ

## Кнігі пра Кітай перададзены хлопцам і дзяўчатам, якія вывучаюць кітайскую мову



**Завяршаецца сумесная акцыя Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі і Выдавецкага дома «Звязда» па дарэнні кніг навучальным установам краіны «Кнігі пра Кітай — моладзі Беларусі».**



Дзясяткі навучальных устаноў краіны — універсітэты, каледжы, гімназіі і школы — атрымалі ў падарунак бібліятэчку кніг на беларускай, рускай і кітайскай мовах, якія прысвечаны Кітаю, кітайскай літаратуры, расказваюць пра Кітай. Усе гэтыя навінкі пабачылі свет на працягу некалькіх гадоў у Выдавецкім доме «Звязда». Днямі падарунак у межах акцыі быў уручаны гімназіі № 36 г. Мінска, дзе наладжана вывучэнне кітайскай мовы на розных узроўнях. Дарэчы, мінскія гімназісты сябруюць з кітайскімі школьнікамі, ужо наведвалі Паднябесную.

У прэзентацыі праекта і перадачы кніг прынялі ўдзел і партнёры Выдавецкага дома «Звязда» — дабрачынны фонд «Бяспечныя дарогі» (гэтую вядомую ў краіне грамадскую ўстанову прадстаўлялі **дырэктар Віктар ЛІШАКОЎ, памочнік дырэктара Таццяна КУРНОСЕНКА**), а таксама СЗАТ «Бяспечныя дарогі Беларусі» (**старшыня назіральнага савета Дзмітрый КУРНОСЕНКА**, намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Медыявымяральнік» Уладзімір Шафарэнка, памочнік кіраўніка СЗАТ «Бяспечныя дарогі Беларусі» Аляксандр Хількевіч). Падчас цырымоніі выступіў і Дзмітрый Курносенка, якія падзяліўся сваімі ўражаннямі ад неаднаразовых наведванняў Кітая, расказаў пра тыя памкненні, што яднаюць нашы краіны, спрыяюць развіццю эканамічных, палітычных узаемаадносін. Дзмітрый Уладзіміравіч згадаў СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка. «Кітайска-беларускі парк «Вялікі камень», перадаў прывітанне ад першага намесніка генеральнага дырэктара Кірыла Карацеева: «Спрыянне, грунт беларуска-кітайскім стасункам у многім закладваецца дзякуючы менавіта развіццю «Вялікага каменя», руплівасці яго супрацоўнікаў. Гэтая ўнікальная ўстанова ўважлівая і да развіцця асветніцкай, адукацыйнай сферы жыцця». Дарэчы, супольная работа СЗАТ «Бяспечныя дарогі Беларусі» і Выдавецкага дома «Звязда» ўжо выявілася ў цэлым шэрагу творчых, знакавых праектаў па пашырэнні кніжнай культуры сярод навучальных устаноў, сярод моладзі, дзяцей, школьнікаў нашай краіны.

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**, расказаўшы пра вопыт кнігавыдання на кітайскую тэму, пажадаў навучэнцам гімназіі ўважліва даследаваць беларуска-кітайскую тэму, плённа вывучаць кітайскую культуру, ініцыіраваць добрыя справы па прадстаўленні ведаў пра Беларусь у кітайскай прасторы.

Уражальным кульмінацыйным момантам сустрэчы выдаўцоў, іх знакавых партнёраў і ініцыятараў акцыі, гімназістаў і настаўнікаў стала імпрэза, у час якой навучэнцы чыталі творы народнага песняра Беларусі Якуба Коласа на роднай мове і ў перакладзе на кітайскую мову. Над падрыхтоўкай такога сапраўднага свята беларуска-кітайскай дружбы працавалі і дырэктар гімназіі № 36 Аляксей Мацкевіч, загадчыца школьнай бібліятэкі Вольга Данілава, настаўніца кітайскай мовы Лола Атаджанава.

Развіталіся госці і гаспадары навучальнай установы з добрым настроем. **Дырэктар гімназіі Аляксей Алегавіч МАЦКЕВІЧ** запрасіў да плённага супрацоўніцтва і Выдавецкі дом «Звязда», і Саюз пісьменнікаў Беларусі.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**
**Фота Кастуся ДРОБАВА.**

## Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

www.bsb.by

Форма 1

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
за 30 сентября 2024 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30 сентября 2024 г. | 1 января 2024 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 327 983 | 211 225 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 6 850 | 5 043 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 259 846 | 203 790 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 293 397 | 322 992 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 139 337 | 114 206 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 68 993 | 48 303 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 135 | 7 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 35 | 35 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 58 012 | 56 067 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | 322 | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 28 798 | 32 124 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 1 183 708 | 993 792 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 40 | 40 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 208 | 671 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 1 005 469 | 848 596 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 263 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | 232 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 8 657 | 12 804 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 1 014 374 | 862 606 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 22 900 | 22 900 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 17 277 | 17 276 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 39 509 | 41 076 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 89 648 | 49 934 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 169 334 | 131 186 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 183 708 | 993 792 |

Форма 2

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за 30 сентября 2024 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30 сентября 2024 г. | 30 сентября 2023 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 19 825 | 12 933 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 610 | 1 303 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 18 215 | 11 630 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 52 217 | 40 129 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 26 456 | 17 423 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 25 761 | 22 706 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 1 575 | 1 013 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (154) | 663 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 69 977 | 47 628 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 239 | (1 778) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 23 138 | 5 265 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 7 842 | 1 047 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 44 577 | 35 780 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 4 483 | 2 274 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 51 257 | 39 590 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 11 563 | 8 751 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 39 694 | 30 839 |

Председатель Правления Дубков С.В.

Главный бухгалтер Бельник А.Н.

Дата подписания: 7 октября 2024 г.

УНП 807000069

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «МОГОТЕКС», г. Могилев, ул. Гришина, 87. УНП 700116054 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронного аукциона**

**Здание столовой**
(назначение: здание специализированное для общественного питания, **1908 кв. м,** инв. номер 700/С-75383), по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гришина, 87**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,5366 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 17.07.2064) для обслуживания здания столовой

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 235 200,00 бел. руб.**
(снижена на 50 %)
Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **2 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.09.2024

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**с 11.00 до 12.00 22.10.2024.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 21.10.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by.**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, E-mail: auction@cpo.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в городе Гродно 19 ноября 2024 года

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га/ срок аренды | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, рублей | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости*, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **г. Гродно, ул. Дубко, в районе здания № 9А** | 1,0009/ 50 лет | Проектирование и строительство объекта «Возведение объекта общественного назначения на земельном участке по ул. Дубко в г. Гродно, в районе здания № 9А» | 156 041,00 | 31 200,00 | 13 734,67 | 437 795,32 |
| | На земельном участке находятся капитальные строения (склады, гаражи, вспомогательное здание, административное здание), сооружения, дорожные покрытия, имеются подземные инженерные коммуникации, зеленые насаждения разных пород, подлежащие сносу по ул. Дубко, 11, 11/1, 11/2, 11/3, 13, пер. Дзержинского, 21 | | | | | | |
| 2 | **г. Гродно, ул. Дубко** | 10,39/ 20 лет | Проектирование и строительство объекта «Жилая многоквартирная застройка с объектами общественного назначения и транспортная инфраструктура в районе ул. Дубко в г. Гродно» | 907 879,00 | 181 500,00 | 137 451,36 | 9 103 173,12 |
| | На земельном участке находятся капитальные строения (здания жилые, мастерские, склады, гаражи, иные нежилые здания), сооружения, фундаменты бывших строений, дорожные покрытия, имеются подземные инженерные коммуникации, зеленые насаждения разных пород, подлежащие сносу по ул. Дзержинского, пер. Дзержинского, ул. Пушкина | | | | | | |

**– Фактический размер убытков определяется после принятия решения о предстоящем изъятии земельного участка, но до принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка организациями, включенными в перечень организаций, осуществляющих определение размера убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, установленный Советом Министров Республики Беларусь.*

Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке организации и проведения аукционов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13.01.2023 г. № 32.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона. Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Гродненским горисполкомом).

**Аукцион состоится 19 ноября 2024 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1.**

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Телефоны для справок в Гродно: 8 (152) 62-60-55, 62-60-56.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе индивидуальный предприниматель или юридическое лицо в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка, а также заключает с организатором аукциона соглашение. Расчетный счет: BY24AKBB30120000418104000000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа – 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Кроме того, в комиссию или организацию представляются: **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; **представителем заявителя** (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. **Консолидированными участниками** для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 14 октября по 13 ноября 2024 года.**

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. В течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона победитель аукциона обязан: согласовать разработанный проект отвода земельного участка для проведения аукциона с установлением его границы; внести плату предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Гродненским городским исполнительным комитетом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); после совершения необходимых оплат, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с Гродненским городским исполнительным комитетом договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений зданий, сооружений либо многоквартирных жилых домов). Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельному участку (в том числе с характеристиками расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Адреса сайтов: Гродненского городского исполнительного комитета http://grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

# ПАДЗЕМНЫЯ СКАРБНІЦЫ

## Колькі ў Беларусі карысных выкапняў?

**Прыродныя рэсурсы забяспечваюць нас усім неабходным. Некаторыя знаходзяцца на паверхні зямлі і даступныя, а ёсць тыя, здабыць якія вельмі няпроста, і без геалагічных даследаванняў не абысціся. У выніку натуральных прыродных законаў і заканамернасцяў размеркаванне карысных выкапняў нераўнамернае. Адны тэрыторыі багатыя на залежы розных каштоўных рэсурсаў, іншыя — бедныя. Беларусь прырода не абдзяліла. «Асартымент» нашых падземных скарбніц дастаткова разнастайны. Аб разведцы і здабычы карысных выкапняў расказала кандыдат геолага-мінералагічных навук, дырэктар Інстытута геалогіі Навукова-вытворчага цэнтра па геалогіі Святлана ДЗЯМІДАВА.**



***— Геалагічныя даследаванні на тэрыторыі сучаснай Беларусі вядуцца з пачатку XIX стагоддзя. Як быццам за мінулыя стагоддзі ўжо ўсё, што было нават вельмі глыбока, разведана. Аднак штогод з'яўляюцца паведамленні аб адкрыцці новых радовішчаў якіх-небудзь карысных выкапняў. Як так атрымліваецца?***

— Прычына ў тым, што геалагічнае вывучэнне нетраў нашай краіны вядзецца бесперапынна. Веды аб будове і складзе зямной тоўшчы пастаянна пашыраюцца з-за выкарыстання новых метадаў атрымання, апрацоўкі і інтэрпрэтацыі геалагічнай інфармацыі, ужывання сучаснай тэхнікі, абсталявання, прыбораў. Гэта дае магчымасць знаходзіць новыя і ўдакладняць вядомыя перспектывы канкрэтных геалагічных структур і комплексаў на наяўнасць карысных выкапняў. Напрыклад, геолагі пастаянна выяўляюць новыя нафтаносныя аб'екты ў Прыпяцкім прагіне, з прычыны ўважлівага вывучэння хімічнага саставу глыбінных горных парод — рудапраяўлення высакародных і рэдказямельных металаў.

***— У цяперашні час выяўлена больш як 30 відаў розных карысных выкапняў, а радовішчаў налічваецца больш чым 5 тысяч. Наколькі запатрабаваны разведаныя запасы і якая патрэба ў новых рэсурсах?***

— Разведаныя карысныя выкапні Беларусі прынята дзяліць на тры групы: тыя, што распрацоўваюцца, тыя, што не распрацоўваюцца, і тыя, што патрабуюць дадатковага вывучэння. Тыя, што распрацоўваюцца, назавуць нават школьнікі: нафта, каменныя і калійныя солі, даламіт, торф, сапрапель, трэпел, кварцавыя пяскі, мел, мергель, будаўнічы і абліцовачны камень, валунна-жвірова-пясчаныя сумесі і будаўнічыя пяскі, гліны, падземныя воды (пітныя і мінеральныя, бальнеалагічныя, геатэрмальныя). Іх даўно і пасьпяхова здабываюць для патрэб эканомікі нашай краіны. Некаторыя віды карысных выкапняў запатрабаваныя на сусветным рынку і могуць накіроўвацца на экспарт. Не распрацоўваюцца радовішчы тых карысных выкапняў, якія пры існуючым узроўні тэхналогій немэтазгодна здабываць, узбагачаць і перапрацоўваць з прычыны складаных горна-геалагічных умоў залягання або якасці сыравіны. Гаворка ідзе пра такія віды, як бурыя вуглі, гаручыя сланцы, жалезныя руды, гіпс, бентанітавыя гліны, фасфарыты, прамысловыя расолы. Важная таксама кан'юнктура рынку мінеральнай сыравіны, гэта значыць існуючая патрэба ў тым ці іншым матэрыяле, яго кошт у бягучых умовах. Да групы карысных выкапняў, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, адносяцца базальты і туфы, баксіт-даўсанітавыя руды, берылій і рэдказямельныя элементы.

У поўным аб'ёме задаволена патрэба краіны ў калійных і каменных солях, торфе, сапрапелі, будаўнічым камені, падземных водах. Досыць высокая забяспечанасць мінеральнай сыравінай прадпрыемстваў будаўнічай галіны, цэментнай прамысловасці. Так склалася, што пэўныя віды мінеральных рэсурсаў у сувязі з запатрабаванасцю на ўнутраным рынку ў тым ці іншым аб'ёме завозяцца з-за мяжы (сырая нафта, каалін і кааліновыя гліны, пясок крамяністы і пясок кварцавы, бентаніт, мел і інш.). Аднак апошнім часам прымаюцца дзейсныя меры, каб у перспектыве ўключыць у распрацоўку некаторыя айчынныя радовішчы і скараціць імпарт. Перспектыўнымі ў дадзеным кірунку лічацца радовішчы кааліну Сітніца, бентанітавых глін — Астражанскае, базальтаў — Навадворскае, баксіт-даўсанітавых руд — Заазёрнае. У цэлым апошнім часам беларускія прадпрыемствы імкнуцца да таго, каб у большым аб'ёме выкарыстоўваць айчынную сыравіну. Адзначаецца павелічэнне здабычы калійных солей, шкляных пяскоў, будаўнічага і абліцовачнага каменя.

***— Нафта — не проста стратэгічна важны, а адзін з самых загадкавых рэсурсаў. Аб яго паходжанні і вычарпальнасці навукоўцы спрачаюцца да гэтага часу. Ацэнкі запасаў рэгулярна мяняюцца. На ваш погляд, прычыны хаваюцца больш у тэхнічным прагрэсе (даразведцы) і з'яўленні новых ведаў або адкрыцці раней невядомых радовішчаў?***

— І даразведка існуючых, і адкрыццё новых радовішчаў даюць прырост запасаў нафты. А агульная ацэнка запасаў вуглевадародаў рэгулярна праводзіцца праз пэўны перыяд. І тут улічваюцца даныя як па прыросце запасаў вуглевадародаў за разгляданы час, так і па аб'ёмах здабычы.

***— Веды аб выкапнёвых рэсурсах, безумоўна, важныя. Але як выбудоўваецца работа са спажыўцамі рэсурсаў?***

— Геолагі праводзяць пошукавыя і разведачныя работы, уключаючы падлік запасаў карыснай сыравіны. Уся інфармацыя аб разведаным радовішчы перадаецца ў Дзяржаўны геалагічны фонд (знаходзіцца на дзяржаўным прадпрыемстве «Белдзяржгеацэнтр»), дзе яна ва ўстаноўленым парадку захоўваецца і даступная для зацікаўленых спажыўцоў па іх запыце.

***— Рэсурсы прынята класіфікаваць як вычарпальныя і невычэрпныя. Ці ёсць прыклады першых, якія б ужо ў нас закончыліся? І якія перспектывы па другіх, ці надоўга іх хопіць?***

— Прыкладаў «вычарпаных» прывесці не магу. Па ўсіх відах карысных выкапняў запасы для будучых пакаленняў ёсць, і значныя. Пры існуючым узроўні здабычы насельніцтва Беларусі больш чым на 50 гадоў забяспечана сыравінай, якая цяпер здабываецца (калійныя і каменныя солі, торф, сыравіна для вытворчасці цэменту, шкла, даламіт, будаўнічы і абліцовачны камень і інш.). З васьмі разведаных радовішчаў солі распрацоўваюцца чатыры; з 94 нафты — 59; са 1038 будаўнічых матэрыялаў (мергельна-мелавыя пароды, гліністыя пароды, пяскі і ПГС, каалін, будаўнічы і абліцовачны камень, даламіт, базальты, гіпс) — 307; са 187 торфу і сапрапелю — 56; са 1208 прэсных, мінеральных падземных і прамысловых вод — 887. Радовішчы жалезных руд, гаручых сланцаў, бурых вуглёў (восем радовішчаў) пакуль не распрацоўваюцца.



***— Здабыча карысных выкапняў — гэта пэўнае парушэнне сфарміраванай экасістэмы. Якім чынам мінімізуюцца негатыўныя наступствы?***

— Так, працэс здабычы карысных выкапняў непазбежна вядзе да парушэнняў у экасістэме. Нярэдка да непазнавальнасці змяняецца аблічча навакольнага ландшафту. Ступень змяненняў залежыць ад таго, якім спосабам вядзецца здабыча — адкрытым (кар'ер) або шахтавым, ад шэрагу іншых фактараў. Аб мінімізацыі наступстваў клапоцяцца яшчэ на стадыі праектавання прадпрыемства па распрацоўцы. Павінны быць прадугледжаны мерапрыемствы па максімальным недапушчэнні шкоды навакольнаму асяроддзю і па ўстараненні або зніжэнні негатыўных наступстваў, па рэкультывацыі тэрыторыі пасля завяршэння распрацоўкі радовішча. Мы можам назіраць нават такія прыклады, калі пасля адпрацоўкі радовішча тэрыторыя ўяўляе сабой прывабную турыстычную лакацыю. Напрыклад, затопленыя мелавыя кар'еры пад Красносельскім. У любым выпадку, экалагічная бяспека — адзін з прыярытэтных аспектаў на ўсіх этапах працэсу арганізацыі здабычы карысных выкапняў.

**Андрэй АКІМАЎ.**

**Фота Унітэхпрама БДУ.**

# ДЗЕ «ПАДЛЯЧЫЦЬ» СТАРУЮ СТРЭЛЬБУ?

## Адкрылася першая сацыяльная майстэрня зброі

**Добры паляўнічы заўсёды ганарыцца сваёй стрэльбай і беражэ яе, бо ад яе стану залежыць яго бяспека — і ў лесе, і ў побыце. У Мінску пад эгідай Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў адкрылася першая ў краіне сацыяльная майстэрня зброі.**

З'яўленне новай майстэрні — падзея рэспубліканскага маштабу. Як адзначыў **старшыня Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Ігар ШУНЕВІЧ,** такіх устаноў у нашай краіне амаль няма. Дзве існыя — камерцыйныя: рамонт і кансультацыя ў іх даступны далёка не кожнаму аматару палявання: і фінансава непад'ёмна, і дабрацца не заўсёды атрымліваецца, і паслугі вузкаспецыялізаваныя. Новы аб'ект, адкрыты на вуліцы Веры Харужай, мае больш шырокую сацыяльную накіраванасць.

**Паводле слоў кіраўніка БТПР, у Беларусі зброю маюць 150 000 чалавек. З іх каля 32 тыс. — члены таварыства. Сярод апошніх даволі шмат пенсіянераў са старымі стрэльбамі. Дарэчы, Ігар Шуневіч прапанаваў арганізаваць транспарціроўку да майстэрні сталых людзей, бо яны часта не маюць магчымасці дабрацца самастойна.**



— Асноўны сэнс работы майстэрні — забяспечыць даступнасць паслуг. А значыць, і бяспеку — як на паляванні, так і ў побыце. У першую чаргу, яна будзе праводзіць рамонт паляўнічай зброі, магчыма, пнеўматычнай, а ў будучыні — і кідальнай, таму што лукі і арбалеты таксама выкарыстоўваюцца ў паляўнічых мэтах. Усё залежыць ад таго, якую практыку мы атрымаем: наколькі майстэрня будзе адпавядаць запытам і складанасці рамонту, — паведаміў старшыня БТПР.

Спектр паслуг новай майстэрні даволі шырокі: усталяванне оптыкі і антабак, выраб прыкладаў, ложаў, рамонт механізмаў зброі і розныя віды яе чысткі, іншыя работы. Знойдуць падыход і да старых стрэльбаў, якія ўжо выпрацавалі свой рэсурс і да якіх цяжка адшукаць дэталі.

— Рамонт старой зброі залежыць ад кваліфікацыі майстра, абсталявання, запасных частак. Аднак у нас ёсць усё, апрача расходных матэрыялаў, — падкрэсліў Ігар Шуневіч. — Неабходныя дэталі будзем шукаць па месцы вытворчасці — тое, што недаступна звычайнаму паляўнічаму.

Паводле яго слоў, попыт на правядзенне работ ужо вялікі — нават у дзень адкрыцця майстру бесперапынна паступаюць званкі. Дарэчы, апрача рамонту, наведвальнік зможа атрымаць кансультацыю спецыяліста па культуры абыходжання са зброяй.

— Я заўсёды агучваю моманты, на якія трэба звярнуць увагу. Рэкамендую пэўную хімію, паказваю, што чалавек прапускае, напрыклад, пры чыстцы зброі. Любая нядбайнасць можа мець наступствы. У няправільна або несвоечасова вычышчанай зброі псуецца ствол, яна можа даць асечку — гэта пагражае трагедыяй на паляванні, — расказаў **загадчык майстэрні Іван КАЗЛОЎ.**

Яшчэ адна цікавая паслуга — прывядзенне старой зброі, напрыклад, даваеннага ўзору, у адпаведнасць з сучаснымі тэхнічнымі стандартамі.

— Паколькі такія стрэльбы часта не маюць правільнага догляду, то і іх знешні выгляд і стан даволі сумныя. Мне падабаецца працаваць з дрэвам, аднаўляць прыклады і прыводзіць усё ў адпаведны выгляд, — дадаў Іван Казлоў.

Апрача памяшкання для рамонту зброі, у майстэрню ўваходзіць склад і навучальныя класы для падрыхтоўкі спецыялістаў па ацэнцы паляўнічых трафеяў.

— Мы вядзём Трафейную кнігу і зацікаўлены, каб было больш экспертаў, якія будуць правільна і кваліфікавана ацэньваць трафеі, выдаваць адпаведныя дакументы і выконваць іншыя фармальнасці, звязаныя з гэтай дзейнасцю. Навучанне будуць ажыццяўляць спецыялісты БТПР, — расказаў старшыня таварыства.

У перспектыве на базе ўстановы плануюць выраблясць і спадарожныя тавары паляўнічай справы (гузікі, медальёны для трафеяў і інш.). Разглядаецца таксама магчымасць павелічэння штату мінімум да трох майстроў. Прычым ахвотныя пры неабходнасці змогуць прайсці ў БТПР спецнавучанне.

**Александрына ПАРШЫНА.**

Сацыяльны клопат

# ІМПУЛЬС ДЛЯ ДАЎГАЛЕЦЦЯ

## Як гродзенцы «сярэбранага» ўзросту ствараюць настрой сабе і іншым

**У гэту паездку да насельнікаў пансіяната «Сасновы бор», што паблізу Гродна, мяне запрасіла актывістка Тэрэза Белавусава. На старонках «Звязды» неаднойчы выходзілі публікацыі аб ёй як аб ахоўніцы крыніц Гродзенскай пушчы. На тых аб'ектах, дарэчы, пабывалі і пацыенты пансіяната. І вось падчас дэкады «Залаты ўзрост», якая традыцыйна праводзіцца ў Гродзенскай вобласці на пачатку кастрычніка, актывістка сабрала такіх жа актыўных гродзенцаў, каб падбадзёрыць пацыентаў пансіяната сваімі творчымі падарункамі.**

«Сасновы бор» — установа, можна сказаць, элітная. Будаваўся аб'ект у 70-я гады мінулага стагоддзя як абласны інтэрнат для ветэранаў вайны і працы. Сёння ён мае статус сацыяльнага пансіяната і даволі запатрабаваны ў рэгіёне. Па словах дырэктара Івана Краўцэвіча, установа разлічана на 80 месцаў, і ўсе яны занятыя.



Насельнікі цёпла сустрэлі гасцей. У складзе валанцёрскай групы — людзі «сярэбранага» ўзросту, якія вядуць актыўны лад жыцця і працягваюць развіваць свае творчыя здольнасці. Напрыклад, старшыня ветэранскай арганізацыі Кастрычніцкага раёна Гродна Уладзімір Цюцюннік у свае 82 гады пастаянны ўдзельнік культурна-масавых і нават спартыўных мерапрыемстваў. Ён расказаў, што большасць членаў супольнасці хоць і маюць сталы ўзрост, але актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, наведваюць фізкультурна-аздараўленчыя цэнтры, гурткі па інтарэсах, харавыя, вакальныя, танцавальныя студыі. Праводзяць сустрэчы з моладдзю. «Нам прыемна сустрэцца з людзьмі нашага пакалення ў год слаўных юбілеяў — 80-годдзя вызвалення Беларусі і 85-годдзя Гродзенскай вобласці. Мы ўсе працавалі на карысць сваёй краіны», — заўважае ветэран.

У складзе Савета ветэранаў гродзенкі Ірына Мурашова і Ларыса Размук. Сваю жыццёвую пазіцыю яны акрэслілі так: «Баліць не баліць, адзеўся, сабраўся — і наперад».

— Я бачу, што жыццё працягваецца, і не адчуваю сябе на свой узрост, бо мне ўсюды трэба паспець. Можна і ўнукамі займацца, і сабе занятак па душы мець. У некаторых пенсіянераў хоць і няма вялікіх клопатаў, а яны ўсё роўна не хочуць нікуды выходзіць. А іншы падняўся, зрабіў прычоску, і ўжо поўны сіл. Я, напрыклад, хаджу на пілатэс — дыхальную гімнастыку. Гэта бясплатна. Можна аздаравіцца без фінансавых затрат, — лічыць Ірына Мурашова, якая больш як 30 гадоў працавала на прадпрыемстве «Хімвалакно».

— Канешне, сваю ролю адыграла пандэмія, але трэба неяк падымацца, працягваць рух. Для гэтага і праводзіцца ў нас дэкада «Залаты ўзрост». Гэта вельмі насычаны мерапрыемствамі перыяд. Але нельга абмяжоўвацца толькі адной дэкадай. Для пажылых у Гродне добра наладжаны службы сацыяльнага забеспячэння, працуюць бясплатныя аздараўленчыя цэнтры, гурткі прыкладнога мастацтва, музычныя, харавыя студыі, ёсць з ільготамі, — дапоўніла сваю сяброўку Ларыса Размук. Жанчына ўпэўнена, што кожны можа знайсці занятак па душы і камфортна адчуваць свой сталы ўзрост.

Такія магчымасці, як аказалася, маюць і жыхары дзяржаўнай сацыяльнай установы «Сасновы бор».

На другім паверсе ў холе стаіць новы тэнісны стол. «Падарунак нашых спонсараў», — каментуе дырэктар. Увогуле, для актыўнага даўгалецця тут ёсць нямала лакацый. Напрыклад, трэнажорная зала, ванна з гідрамасажам. Але больш за ўсё ўразіў саляны пакой. Ён абсталяваны за кошт сродкаў мясцовых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Падобных пакояў у пансіянатах вобласці толькі два. «Нашы пацыенты любяць сюды хадзіць. Праводзім два-тры сеансы на дзень па 40 хвілін. Для рэлаксацыі гучыць спакойная музыка», — расказвае дырэктар.

Пераважная большасць жыхароў пансіяната інваліды першай і другой групы, сярэдні ўзрост складае 86 гадоў. Нямала і такіх, каму пераваліла за 90. Палова насельнікаў на ложкавым рэжыме. Гэта людзі, якія перанеслі інсульты, а таксама вельмі ўзроставыя пацыенты.

— Многія больш-менш актыўныя, стараюцца не ляжаць, а рухацца. Усіх, хто можа хадзіць, заахвочваем да гэтага. У нас вопытны і вельмі ветлівы медыцынскі персанал. Акрамя ўрача і фельчара, працуе дыетолаг, фізіятэрапеўт, малодшы персанал, усяго 30 чалавек. Ёсць пакой псіхалагічнай разгрузкі, пакой для творчасці, трэнажорная зала, фітабар. Для падвозу ў паліклініку закуплены дзве спецыялізаваныя аўтамашыны. Пры неабходнасці возім нашых пацыентаў на абследаванне да вузкіх спецыялістаў у Гродна. Абласны цэнтр — за некалькі кіламетраў ад пансіяната, — расказвае дырэктар установы падчас экскурсіі па аб'екце. Прыезд гасцей «сярэбранага» ўзросту — сваёго роду стымул для жыхароў пансіяната ў захаванні пазітыўнага настрою.



### У тэму

На сёння ў Гродзенскай вобласці пражывае амаль 270 тысяч людзей сталага ўзросту, з іх 62 тысячы працягваюць сваю працоўную дзейнасць. У рэгіёне павялічылася колькасць доўгажыхароў. Цяпер тут пражывае 78 чалавек, старэйшых за 100 гадоў.

У вобласці дзейнічае 19 пансіянатаў, 20 цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Тут створаны ўсе ўмовы для падтрымкі актыўнага ладу жыцця, пераадольвання сацыяльнай ізаляцыі.

Каля паўтысячы чалавек Гродзеншчыны выступаюць у якасці валанцёраў «сярэбранага» ўзросту па аказанні дапамогі інвалідам, сем'ям, беручы ўдзел у рэалізацыі сацыяльных праектаў.

Па словах арганізатара Тэрэзы Белавусавай, усе ўдзельнікі выязной групы ўнеслі значны ўклад у развіццё горада і рэгіёна. Сярод іх — кіраўнікі ўстаноў, выкладчыкі, музейныя работнікі, народныя майстры. Напрыклад, Барыс Ерузалім прывёз свой аўтарскі фільм пра фестываль нацыянальных культур, які стаў традыцыйным у Гродне. А цяпер працуе над экспазіцыяй музея ў сярэдняй школе і ў сінагоге. Выкладчык Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта і па сумяшчальніцтве бард Аляксандр Філіпаў выканаў папулярны шлягер 80-х гадоў. Народны майстар Ларыса Дунаева прэзентавала жыхарам пансіяната свае мяккія цацкі. Яна расказала, што захапілася іх стварэннем падчас работы ў Доме дзіцяці, у многіх дзіцячых установах ёсць яе вясёлыя лялькі.

— Гэта захапленне значна ўпрыгожвае маё жыццё, бо я раблю ў асноўным твары з вясёлым настроем, каб лялькі ўсміхаліся. Хочацца несці радасць. У сваю чаргу, і лялькі падбадзёрваюць мяне сваім настроем, натхняюць фантазіраваць, нешта прыдумляць. Мне нават не хочацца іх прадаваць, таму вырашыла, што буду іх проста дарыць. Сёння я падарыла сваіх гномаў усім жанчынам пансіяната, — расказала майстрыха.

— Мы спявалі, расказвалі аб нашым крынічным краі, паказалі фільм, падарылі салодкія пачастункі. Гэтым самым імкнуліся падкрэсліць, што жыццё поўнае радасці. Думаю, што мы і надалей будзем падтрымліваць такія кантакты. Магчыма, правядзём майстар-клас па пашыве мяккіх цацак, з'ездзім яшчэ раз на крыніцы, прыедзем з выступленнем нашых музыкантаў і спевакоў. Бо, калі ёсць узаемаадносіны, тады чалавеку лягчэй, — выказала меркаванне Тэрэза Белавусава.

Менавіта ад адзіноты знайшла прытулак у пансіянаце гродзенка Дына Вячаславаўна. Калісьці яе гарадская кватэра была поўная блізкіх людзей, часта прыязджалі госці. Але з цягам часу жытло апусцела, жанчына засталася зусім адна. Сваім сённяшнім становішчам яна задаволена. «Для адзінокіх гэта вельмі добра, бо дома мне стала вельмі складана сябе абслугоўваць, праблематычна схадзіць у краму, прыгатаваць ежу. Добра, што сюды атрымалася ўладкавацца, знаёмыя дапамаглі сабраць дакументы». Прыезд творчых пенсіянераў яе вельмі парадаваў. «Добра, што ў нас такія адкрытыя і душэўныя сустрэчы. Дзякуючы ім адчуваем сябе ў гушчы падзей», — сказала жанчына на развітанне. Між тым у самім пансіянаце таксама нямала цікавых і таленавітых людзей, якія прадэманстравалі свае вакальныя і творчыя здольнасці. Для заняткаў тут створаны ўсе ўмовы. А сустрэчы з валанцёрамі сталі дадатковым імпульсам для актыўнага даўгалецця.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Новыя кнігі

# КУПАЛА: АД «МУЖЫКА» ДА «МАГІЛЫ ЛЬВА»

**У «Мастацкай літаратуры» выйшла новае выданне зборніка вершаў народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.**

Мы прызвычаіліся, што творчасць класікаў беларускай літаратуры новым пакаленні чытачоў адкрываюць альбо па хрэстаматыях, школьных падручніках, альбо па зборах твораў ці на крайні выпадак — зборах выбраных твораў у двух ці болей тамах. А часам узнікае жаданне мець пад рукою невялікі зборнічак, невялікую кніжачку, якая прадстаўляла б найлепшыя, найболей запамінальныя, раней знаёмыя творы. І тыя, што песнямі гучаць, і тыя, што па памяці вучылі ў школьныя гады...




У «Мастацкай літаратуры», магчыма, улічваючы і гэтую акалічнасць, гэтую чытацкую запатрабаванасць, па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выйшла кніга Янкі Купалы «Мая малітва». Пачынаецца зборнік славутым вершам «Мужык». «Што я мужык, усе тут знаюць, // І, як ёсць гэты свет вялік, // З мяне смяюцца, пагарджаюць, — // Бо я мужык, дурны мужык./ Чытаць, пісаць я не ўмею,/ Не ходзіць гладка мой язык,/ Бо толькі вечна ару, сею, — // Бо я мужык, дурны мужык. // Бо з працы хлеб свой здабываю...» А завяршае «Маю малітву» раздзел з паэмамі —»Курган», «Бандароўна», «Магіла льва». Заключная страфа з «Кургана», паэмы, якая напісана ў 1910 годзе: «Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той, // Не зазнаў бы ніколі ўжо гора... // Можна тут веру даць, толькі слухаць душой... // Курганы шмат чаго нам гавораць».

«Мая малітва», якую ўклаў паэт Алесь Бадак, выйшла ў афармленні Міхаіла Дайлідава (ён і аўтар афармлення серыі) у серыі «Новая бібліятэка беларускай паэзіі». Паэзія генія беларускага слова заўсёды жывая і новая пры кожным яе чарговым прачытанні.

Набыць кнігу можна ў кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй краіне і ў Мінску ў кнігарні «Акадэмкніга» па адрасе: праспект Незалежнасці, 72. Новых чытацкіх сустрэч з Янкам Купалам!

# «Суперсябра К» наведаўся да паліграфістаў

**Валянціну Драбышэўскую, паэтэсу, празаіка, дзіцячую пісьменніцу, перакладчыцу, аўтара Выдавецкага дома «Звязда», добра ведаюць у многіх школах і бібліятэках Мінска, ды і ўвогуле нашай краіны. Са сваім творчым праектам «У пошуках суперсябра К», галоўнай мэтай якога з'яўляецца прапаганда дзіцячай кнігі, дзіцячага чытання, пісьменніца пабывала ў многіх куточках Беларусі.**

А днямі Валянціна Драбышэўская правяла квэст-гульню для маленькіх жыхароў інтэрната Паліграфкамбіната імя Якуба Коласа. Дзеці з радасцю, весела ўдзельнічалі ў сапраўдным свяце: адгадвалі загадкі, спявалі песні, чыталі вершы, на некаторы час станавіліся акцёрамі ў тэатрах-экспромтах, наладжаных Валянцінай Драбышэўскай. А яшчэ юныя ўдзельнікі сустрэчы знайшлі чароўны ключ і зрабілі сапраўднае адкрыццё: «Суперсябра К — гэта кніга!»

Усе этапы гульні патрабавалі ўвагі, актыўнага ўдзелу літаральна кожнага з хлопчыкаў і дзяўчынак. Не засталіся ўбаку нават бацькі юных удзельнікаў сустрэчы з пісьменніцай. Пераможцы квэст-гульні атрымалі дыпломы ад Выдавецкага дома «Звязда», а галоўным падарункам для дзяцей сталі новыя кнігі Валянціны Драбышэўскай: «Секретно! Для мальчишек!», «Секретно! Для девчонок!», «Тринадцать перевоплощений».

Дарэчы, у «Звяздзе» падрыхтавана да друку новая кніга Валянціны Драбышэўскай. Гэтым разам пісьменніца раскажае пра больш складаную тэму — пра лёс дзіцяці ў Вялікую Айчынную вайну.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Свеціць мне зорка

# ПАПЛАЎСКІ

## Словы пра графіка і жывапісца Георгія Паплаўскага





### ІНДЫЯ

Маё знаёмства з творчасцю Паплаўскага, як ні дзіўна, пачалося не з ілюстрацый да казак і не з малюнкаў да літаратурнай класікі, а з твораў, прывезеных з вандровак па Індыі. Як і большасць маіх аднагодкаў, я зачытваўся часопісам «Вокруг света» і марыў пра падарожжы ў далёкія краіны. Кнігі Тура Хеердала пра плаванне на папірусным караблі і кнігі Ракуэла Кэнта пра снежны край эскімосаў я не проста чытаў, але яшчэ і пераказваў аднакласнікам. Таму і малюнкі Георгія Паплаўскага, прывезеныя з Індыі, мяне на выставе спынілі. Было відаць, што мастак бачыў на свае вочы тое, што намаляваў. Гандляр збанкамі, вулічны музыка, збіральніцы бананаў, пакупнікі гарбаты на аркушах, сабраных у «Індыйскі дзённік», мяне зачаравалі. Праўдзівае мастацтва і мусіць зачароўваць, мусіць натхняць на вандроўку ў далёкі свет. Разглядаючы «Індыйскі дзённік», я паверыў, што і сам змагу, стаўшы дарослым, паехаць у Індыю і там зрабіць дзённік. Так яно і здарылася. У мяне не атрымалася захапіцца Індыяй, як ёй захапляўся Георгій Паплаўскі, але дзякуючы яго мастакоўскаму дзённіку ў мяне атрымалася захапляцца Каталоніяй і Тайландам.

### ПОЎНАЧ

Некалі Ісаак Левітан прызнаваўся сябрам, што не любіць зіму. Здавалася б, мастак, пагатоў пейзажыст, мусіць роўна ставіцца да самых розных праяў прыроды. Левітан любіў вясну, лета і восень. Відавочна. Я не чуў і не чытаў, каб Георгій Паплаўскі выказваўся пра любімую і нелюбімую пару, ён з аднолькавым поспехам маляваў усе чатыры пары года, але, на мой густ, зіма ў Паплаўскага атрымлівалася больш натуральна. У яго творах багата снегу, холаду, стрыманых герояў з поўначы. Гэта і рыбакі з Браслаўшчыны, і тамтэйшыя льнаводы. Гэта персанажы «Лядовай кнігі» Юхана Смуула і падарожнікі-навукоўцы з серыі малюнкаў «Белы кантынент». Выбіраючы паміж хакеістамі і футбалістамі, Паплаўскі выбіраў і маляваў хакеістаў. Афорт «Варатар», зроблены ў 1969 годзе, гэтаму выдатны прыклад. А разглядаючы вогненна-пякучыя перцы і халаднавата-зялёныя пёры цыбулі, Георгій Паплаўскі выбіраў і пісаў зялёную цыбулю.

### ЦАЦАЧНАСЦЬ

Цацачнасць, лялькавасць, а часам і манекеннасць вобразаў ёсць у свеце, які стварыў для нас таленавіты Паплаўскі. Першыя прызнанні да яго прыйшлі пасля лінагравюр, якімі аздоблены эстонскія і беларускія казкі. Менавіта гэтыя поспехі казачных вобразаў мастак і развіваў усё жыццё. Таму нават літаграфіі і афорты, зробленыя да сусветнай літаратурнай класікі, выглядаюць у Паплаўскага як сцэны з лялечных спектакляў. Усе лялькі Георгія Паплаўскага зроблены рукой вялікага майстра, але гэта ўсё адно лялькі, нават калі гэта вобразы славянскіх ваяроў, ангельскіх каралёў, савецкіх вайскоўцаў, суровых рыбакоў і свабодалюбівых індзейцаў.

### КАШКУРЭВІЧ

Мастацтва не спорт, і спаборніцтва сярод мастакоў не такое, як на стадыёнах паміж атлетамі, але яно прысутнае. Леанарда спаборнічаў з Мікеланджэла, Ван Гог — з Гагенам, Пікаса — з Бракам... Георгій Паплаўскі спаборнічаў з рознымі мастакамі, у жывапісе ён спрабаваў стаць лепшым за Міхаіла Савіцкага, у падарожных замалёўках ён пераўзышоў амаль усіх беларускіх мастакоў-вандроўнікаў, але асноўнае спаборніцтва ў яго разгарнулася з графікам Арленам Кашкурэвічам. Маладому Паплаўскаму і маладому Кашкурэвічу даручылі аформіць па кнізе казак. Кашкурэвічу далі Андэрсена, а Паплаўскаму — братоў Грым. Абодва зрабілі цудоўнае аздабленне класічных гісторый. На тых кнігах выгадавалася цэлае пакаленне тутэйшых дзяцей. Сказаць, што Кашкурэвіч зрабіў кнігу крышачку лепей за Паплаўскага, можна. Напэўна, нешта такое і казалі, бо Паплаўскі пачаў усё далей і далей адыходзіць ад жывапісу ды больш і больш займацца графікай, займацца, як той Кашкурэвіч, афортамі, лінарытамі і аздабленнем шыкоўных кніжак. Жывапіс у творчасці Паплаўскага адышоў на другі план, пра што варта пашкадаваць. У графічных аркушах Георгій Паплаўскі дасягнуў вялікіх поспехаў і стварыў сваю акадэмічную майстэрню. Ці выйграў ён доўгатэрміновы творчы двубой з Арленам Кашкурэвічам? Нехта скажа, што выйграў, хтосьці прамаўчыць ці прапануе ганаровую нічыю, спаслаўшыся на тое, што мастацтва не спорт. На мой суб'ектыўны погляд, Кашкурэвіч калі і не выйграў двубой з Паплаўскім, дык толькі таму, што быў заняты спаборніцтвам з іншымі мастакамі, такімі як Эрні, Гутуза і Пікаса.



### БЫКАЎ

Графікі, асабліва тыя з іх, хто аздабляе кнігі, выглядаюць значна разумнейшымі за калег жывапісцаў і скульптараў. Нават калі скульптар ці жывапісец зробіць бюст вялікага паэта, гэта зусім не доказ таго, што ён уважліва чытаў яго вершы. Фотаздымкі паразглядаў і зрабіў нешта-нейкае, падобнае на тыя фотаздымкі. Графіку даводзіцца ўдумліва чытаць тэксты, расплывістае вербальнае пераводзіць у дакладнае візуальнае, значна больш напружвацца. Таму і павагі да графікаў у мяне больш. Магу сказаць, што графіка Георгія Паплаўскага я паважаў так, як і літаратара Васіля Быкава, да прозы якога ён рабіў ілюстраванне. Паплаўскі ілюстраваў не толькі Быкава, але і Мележа, і Коласа, і Тагора, і Шэкспіра. Аднак мая павага да Паплаўскага вымяраецца павагай менавіта малюнкамі да прозы Васіля Быкава, бо ўсё ж боганатхнёнага Шэкспіра з яго ілюстратарамі я шаную крыху больш.

### ВЯЛІКАЕ ПАЛАТНО

Ёсць у гісторыі мастацтваў і такі феномен, як ненапісанае вялікае палатно. Прыкладам можа паслужыць няздзейсненая задума Паўла Корына «Русь, якая сыходзіць». Корын зрабіў шмат эскізаў і эцюдаў для сваёй «Русі...», але скончыць задуманае не змог. Так і мой даўні сябар Андрэй Радзівонаў распачаў працу над вялікім палатном «Сляпыя», і яно больш за дваццаць гадоў усё яшчэ не завершана і да завяршэння нават не рухаецца. Графік Паплаўскі ў маладосці пісаў выдатныя карціны, былі сярод іх запамінальныя шэдэўры. Прынамсі, мне падабаліся і «Браслаўская калгасніца», і «Новы горад», і «Брыгада здабытчыкаў тралмайстра Туманава». Найбольшае ўражанне зрабіў «Сейбіт». Афорт з серыі «Браслаўшчына — край азёрны» мастак перанёс на палатно і апрануў селяніна-сейбіта ў пурпурна-чырвоную кашулю. Колер кашулі заваражваў. Пэўна, таму я і чакаў ад Паплаўскага не графікі, якой ён рабіў і выстаўляў шмат, а карцін. Іх не было. І аднаго разу ў размове з архітэктарам Алегам Хадыкам я пацікавіўся, што той думае пра жывапіс Паплаўскага. Адказ я атрымаў нечаканы. Хадыка расказаў, што ў майстэрні Георгія Паплаўскага стаіць вялікае чыстае палатно, на якім той збіраецца напісаць па-сапраўднаму вялікую карціну. Мне тады ўявілася палатно з сялянамі Браслаўшчыны, і я чакаў яго, чакаў вялікую карціну ад Паплаўскага, але яна не адбылася, не здарылася, не з'явілася... Сумна.

### ЛОКЦІ

Ёсць бясконцая спрэчка, якая ніколі не знікае ў мастакоўскім асяроддзі. Спрэчка вакол аднаго пытання... Што больш важнае — форма ці змест? Што маляваць ці як намаляваць? Ёсць часы, калі ў спрэчцы перамагаюць змястоўнікі, а ёсць і ўзлёты фармалістаў. Для Паплаўскага форма мела вялікую каштоўнасць, а таму ён мог сказаць вучням, што тры гады вучыўся маляваць локці. Толькі на вывучэнне локцяў у майстра сышло ажно тры гады. Тут трэба ўдакладніць, што локці Паплаўскі навучыўся маляваць на выдатна, маляваць узорна, такому можна і пазайздросціць. Дарэчы, не толькі локці ў Паплаўскага атрымліваліся бездакорна. Ён з тых мастакоў, хто даводзіў свае малюнкі да ювелірна зробленага пазногця, які ставіўся на патрэбным месцы.

### АДАМОВІЧ

Мастак Паплаўскі меў прызнанне і вялікую прыжыццёвую вядомасць. Вакол яго заўсёды было шмат знакамітых і зорных людзей, сярод якіх можна вылучыць літаратара Алеся Адамовіча. Паплаўскі маляваў Адамовіча з натуры, а потым выканаў партрэт у тэхніцы літаграфіі. У Паплаўскага атрымаўся ці не найлепшы партрэт нястомнага апантанага публіцыста. Адамовіч таксама зрабіў партрэт Георгія Паплаўскага: «Гэта старая ісціна, што ўнутраны свет чалавека наўпрост знітаваны з тым, што ён робіць, піша, малюе. Тым больш, калі гэта чалавек з такім талентам, як у Паплаўскага. Ён чалавек вельмі сур'ёзны і глыбокі. Ён піша пра такія сур'ёзныя рэчы, як мір, як вайна, як трагізм у сучасным свеце. Ён задумваецца над тым, як абараніць гэты свет тымі сродкамі, якія ў яго ёсць». Дадам яшчэ колькі слоў у партрэт мастака. З усіх беларускіх пісьменнікаў светагляд Алеся Адамовіча быў самым блізкім да светагляду мастака Георгія Паплаўскага, таму іх партрэты адно аднаго такія дакладныя і пераканаўчыя.

### СЯМ'Я

Шмат для якіх творцаў сям'я была ці не галоўнай падтрымкай. Вядома, што без брата Тэа не расквітнеў бы сонечны талент Вінсэнта Ван Гога, а без Фрыды Кало быў бы іншым лёс у вялікага мексіканскага манументаліста Дыега Рыверы. Так і Георгію Паплаўскаму пашанцавала з таленавітымі жанчынамі — жонкай і дачкой. Жонка Наталля рабіла карункавыя акварэльныя малюнкі да казак, а дачка Кацярына малявала запамінальныя мінскія краявіды. Побач з творамі дачкі і жонкі малюнкі Георгія Георгіевіча Паплаўскага выглядаюць менш тэатральнымі, а робяцца яшчэ больш мужнымі і праўдзівымі. Думаю, што Георгію Паплаўскаму не трэба было перажываць за лёс творчай спадчыны, як даводзіцца перажываць і маркоціцца людзям самотным і бяздзетным. Мне давялося папрысутнічаць пры перадачы Уладзімірам Караткевічам сваіх рукапісаў у дзяржархіў. Ён жартаваў, весяліў архівістак, але на душы ў яго ляжаў цяжар несвоечасовай страты, бо даводзілася рабіць тое, што мусілі пазней зрабіць спадкаемцы. Зрэшты, у кожнага творцы ўласны шлях, і добра, што ў Паплаўскага атрымалася стварыць не толькі малюнкі і карціны, але і пражыць доўгі шчаслівы век у творчай сям'і.

**Адам ГЛОБУС.**



**Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»**
220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by

Форма 1

## Бухгалтерский баланс 30 сентября 2024 г.

ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2024 год | 2023 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 225 611 | 227 827 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 2 984 | 3 652 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 426 127 | 383 346 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 521 740 | 469 250 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 862 266 | 840 413 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 967 819 | 2 625 105 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 2 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 1 678 | 1 363 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 203 677 | 207 546 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 272 | 7 819 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 6 209 | 6 206 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 46 210 | 75 143 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **5 264 595** | **4 847 670** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 82 | 237 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 871 752 | 460 525 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 3 297 686 | 3 366 707 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 27 837 | 28 825 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 40 790 | 35 062 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 238 147 | 3 891 356 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 348 161 | 348 161 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 186 450 | 186 450 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 90 166 | 77 672 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 401 671 | 344 031 |
| 31 | Всего собственный капитал | 121 | | 1 026 448 | 956 314 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **5 264 595** | **4 847 670** |

Форма 2

## Отчет о прибылях и убытках за 1-3 квартал 2024 г.

ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2024 год | 2023 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 289 756 | 213 726 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 126 659 | 90 093 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | | 163 097 | 123 633 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 152 052 | 116 388 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 50 272 | 36 972 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | | 101 780 | 79 416 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 2 726 | 541 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (122) | 2 277 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 43 250 | 43 551 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 18 | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 11 291 | 22 115 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 14 564 | 13 055 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 167 450 | 136 603 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 6 960 | 3 602 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 139 612 | 100 153 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 21 998 | 13 739 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **117 614** | **86 414** |

Заместитель председателя правления К.А. Кирьянов

Главный бухгалтер Н.А. Самусевич

Дата подписания: 2 октября 2024 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 23.02.2024.
УНП 100429079

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Лот:**

- капитальное строение с инвентарным номером 120/С-17513 (наименование: фирменный оптово-розничный магазин; назначение: здание специализированное розничной торговли) площадью 529,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000170 площадью 0,0719 га, составные части и принадлежности: рампа;
- система пожарной сигнализации 36.785.388 (инвентарный номер по бух. учету 35), расположенная по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5;
- установка охранной сигнализации (инвентарный номер по бух. учету 49), расположенная по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5;
- теплосчетчик (инвентарный номер по бух. учету 10), расположенная по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5;
- система видеонаблюдения (инвентарный номер по бух. учету 5359), расположенная по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 218 994,01 | Размер задатка, руб. | 10 949,70 |
|---|---|---|---|

**Организатор торгов, оператор электронной торговой площадки:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701, gostorg.by.
**Продавец:** ОАО «Гомельдрев», 246042, г. Гомель, ул. Достоевского, 3, тел./факс 80232257324. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901, назначение платежа: задаток за участие в аукционе по продаже объекта ОАО «Гомельдрев».
**Условия продажи:** без условий.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
**Условия оплаты:** в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает вознаграждение Организатора торгов и фактические затраты на организацию и проведение электронных торгов.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона.
**Шаг торгов:** 5 %

**Электронные торги состоятся 23 октября 2024 г. в 11.00**

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG».
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП

**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 21.10.2024 до 16.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие **«Витебский областной центр маркетинга»** извещает о проведении электронных торгов **№ 2024.Г.002.00115** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Администрация Ленинского района г. Бобруйска, 213826, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Советская, 78, тел. 80225 76 52 33.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:**
коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 12.11.2024 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1. Легковой автомобиль седан MERSEDES–BENZ C180,**
2002 года выпуска, кузов (рама) WDB2030351A315277, цвет – черный, 2,0 л бензиновый двигатель, инвентарный № 01510001, регистрационный знак 3512 IM-6 по адресу: 213826, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Советская, 78.

**Нач. цена: 9600,00 бел. руб. без НДС.**
**Задаток: 960,00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 11.11.2024.**

Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, в т. ч. услуги оператора ЭТП, расходы Продавца на проведение рыночной оценки в сумме 270,33 руб. с НДС; заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи. Имущество бывшее в употреблении. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375296988786 (Сергей Петрович). Организатор торгов имеет право отказаться от проведения торгов в любое время, не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения торгов.

С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: транспорт – легковые автомобили.

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «БЗПИ»** (Продавец)

Аукцион состоится **14.11.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:**

**1. Изолированное помещение № 2 Прессового цеха,** инв. № 610/D-73392, 5088,8 кв. м.
**2. Гаражи,** инв. № 610/С-27578, 1700 кв. м.
**3. Зарядно-аккумуляторная станция,** инв. № 610/С-27524, 634,2 кв. м.
**4. Пристройка к теплице,** инв. № 610/С-27532, 21 кв. м.
**5. Склады, примыкающие к гаражу,** инв. № 610/С-27669, 228 кв. м.
**6. Здание на 2 бокса автомашин,** инв. № 610/С-27548, 92 кв. м.

Адрес: **Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 97А-2, 97Б, 97Б/1, 97Б/2, 97Б/3, 97Б/4.**

Изолированное помещение № 2 Прессового цеха, инв. № 610/D-73392 находится в капитальном строении с инвентарным номером 610/С-27673, расположенном на земельном участке площадью 1,1599 га с кадастровым номером 620850100014000977. Право аренды.

Капитальные строения с инв. № 610/С-27578, 610/С-27524, 610/С-27532, 610/С-27669, 610/С-27548 расположены на земельном участке площадью 0,7823 га с кадастровым номером 620850100014000978. Право аренды.

Начальная цена с НДС 20 % – 3 676 523,83 руб.
Задаток – 73 530,48 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – **12.11.2024 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **КУП «МИНОБЛАВТОСЕРВИС»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения.

Аукцион состоится **24.10.2024 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

**Лот № 1: ГАЗ 2705,**
кузов (рама) № 27050080383763, X9627050080607931.

Начальная цена с НДС 20 % – 4 692,00 руб.

**Место нахождения:** г. Минск, ул. Петруся Бровки, 27.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» Организатора аукциона gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов по продаже права заключения договора аренды сроком на три года имущества, принадлежащего **РУП «Белпочта»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 18.11.2024 в 11.00.**

**Лот № 1:**
**Право заключения договора аренды части** (помещения на 1-м этаже площадью 110,7 кв. м) **здания специализированного связи с инв. № 500/С-40514.**

Адрес: **г. Минск, ул. Героев 120-й Дивизии, 9.**

Начальная цена без НДС – 491,51 руб.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

**Государственным предприятием**
## «БелЮрОбеспечение» (192821149)
**назначено проведение электронных торгов:**

| | |
|---|---|
| Организатор | Филиал № 5 «Гродненский КСМ» ОАО «Красносельскстройматериалы» |
| Предмет | Лот № 9.2024.10.00046 клуб-столовая, площадью 2328,1 кв. м |
| Местонахождение | г. Гродно, ул. Санаторная, 5Б |
| Начальная стоимость | 521 171,00 бел. руб. с НДС |

Торги будут проведены **24.10.2024 с 9.00 до 18.00** на ЭТП e-auction.by.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок **до 16.00 23.10.2024.**

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*Алёна Беланожка працуе ў сферы культуры, яна рэжысёр і сцэнарыст шматлікіх тэатралізаваных мерапрыемстваў. Аўтар прыгодніцкіх аповесцяў у жанры іранічнага дэтэктыву, апавяданняў, вершаў, песень. Сярод яе творчых набыткаў — кнігі «Чамадан з кракадзілавай скуры», «Зорка Ракхігархі», «Дзіця Зямлі». З апавяданнем «Завушніцы» пісьменніца ўвайшла ў тройку пераможцаў конкурсу «Звязды» за 2022 год, мае адзнакі ў іншых літаратурных спаборніцтвах.*

*У апавяданні «Лялька» Алёна Беланожка запрашае нас зірнуць навокал вачамі дзяўчынкі Аміны, якая не разумее, чаму ў людзях раптам прачынаецца нянавісць, навошта яны варагуюць і знішчаюць утульны і прыгожы свет, дзе так добра назіраць за сонцам і зоркамі, пячы духмяны хлеб, сябраваць. Пазбаўлены канкрэтных прыкмет месца і часу твор гучыць як прытча і папярэджанне: самае каштоўнае — гэта мір, беражыце яго, людзі...*

**Алена БРАВА.**

## Алёна БЕЛАНОЖКА

# ЛЯЛЬКА



Аміна прачнулася з першымі прамянямі сонца і, як была, босая пабегла на дах дома, у якім жыла разам з бацькам. Учора яна прапусціла світанне і да вечара крыўдзілася на бацьку: ён не разбудзіў Аміну, таму што хацеў, каб яго «маленькая прынцэса» паспела дагледзець свой салодкі сон. Але сёння дзяўчынка прачнулася першая — і сама не стала будзіць бацьку. Няхай выспіцца ў выхадны дзень, ён многа працуе.

Дом стаяў на ўскрайку горада. За горадам пачыналася пустыня.

Аміна любіла сядзець на плоскім даху і глядзець, як сонца павольна паднімаецца з-за далягляду, залівае золатам неба, камяні, пяскі, асвятляе рэдкія кусцікі калючых пустынных раслін, у якіх было столькі прагі да быцця, што хапіла б на некалькі жыццяў. Ноччу ў пустыні няўтульна — толькі цёплае пакрывала і добрае вогнішча ратуюць падарожніка ад холаду. Але чым вышэй узыходзіла сонца, тым хутчэй паветра напаўнялася цеплынёй, а наваколле — святлом. Прыходзіў новы дзень. Горад прачынаўся.

Потым на дах паднімаўся бацька. Ён моўчкі сядзеў побач з Амінай некалькі хвілін, цалаваў яе ў шчаку і казаў:

«Новы дзень — новыя радасці!»

Бацькавы рукі пахлі хлебам. Ён трымаў пякарню — найлепшую ў квартале. Шэсць дзён на тыдзень уставаў раней за сонца, каб у людзей на сняданак быў свежы хлеб — тонкі лаваш, мяккі барбары, хрумсткі тафтан. Людзям падабаўся бацькаў хлеб: перад адкрыццём крамы ля ўваходу заўсёды стаяла чарга пакупнікоў.

З суседняга дома выходзіла старая з мяцёлкай у руках. Старая жыла адна, у яе не было сваякоў. Ніхто не помніў яе імя, усе звалі проста — Альта. Аміна звала яе «бобу» — бабуля. Кожную раніцу старая падмятала вуліцу каля свайго дома.

— Татуль, ты не забыўся пра бобу? — пыталася Аміна.

— Не забыўся, — адказваў бацька. — Пойдзем хутчэй!

Бацька браў Аміну за руку. Па халаднаватых каменных прыступках яны разам спускаліся ў пякарню, дзе ўжо ляжаў на сталах хлеб і чакаў сваіх пакупнікоў.

— Выберы той, што табе падабаецца! — казаў бацька.

Аміна выбірала самы румяны кругляш, хапала яго і з усіх ног бегла да старой.

— Бобу, хлеб! — крычала Аміна замест прывітання.

Старая раскідвала рукі для абдымкаў:

— Добрай раніцы, маё сонейка! Ці добра табе спалася?

— Добра, бобу! Сёння я не спазнілася, сустрэла сонца!

— І заслужыла смачны сняданак. Пойдзем, прынцэса.

Аміна ўваходзіла ў дом старой. Яна налівала ў кружкі малако, разломвала хлеб і аддавала палову Аміне. За сняданкам яны размаўлялі. Аміне хацелася ведаць пра ўсё на свеце! У старой на ўсе яе пытанні быў гатовы адказ.

— Чаму сонца кожны вечар хаваецца ад людзей, бобу?

— Каб раніцай людзі зноў радаваліся яго з'яўленню.

— Адкуль бярэцца вецер?

— Вецер — гэта абдымкі тых, хто нас вельмі любіць, але не можа быць побач з намі.

— А калі ён паднімае пяскі, раве, збівае з ног?

— Значыць, нехта па нас вельмі, вельмі сумуе...

— Адкуль на небе зоркі, бобу?

— Зоркі — гэта вочы людзей, што калісьці жылі на зямлі, а пасля паляцелі на неба. Паглядзі, колькі іх: незлічона! Калі-небудзь мае вочы таксама зробяцца зоркамі і будуць любавацца табою з вышыні!

— А як я даведаюся, дзе сярод іх — твае?

— Проста зразумееш.

Аміна дапівала малако і выцірала пенку з вуснаў. Старая казала:

— Зараз будзем шыць!

Яна брала іголкі, ніткі і пярэстыя кавалкі тканіны і вучыла Аміну шыць лялек. Здаралася, што Аміна калола сабе пальцы іголкай. Тады старая дзьмула на ранку і шаптала:

— У Аміны не баліць, не баліць! — і боль праходзіў.

Калі ж Аміна стамлялася, то прасіла:

— Раскажы казку, бобу!

Старая садзіла Аміну сабе на калені і пачынала расказваць казку. Казкі былі кожны раз розныя, але заўсёды — пра дзяўчынку, якая нічога не баялася: ні начной цемры, ні жоўтых пяскоў, ні яшчарак, што забіраліся ў яе пакой і бегалі па сценах, смешна перабіраючы спрытнымі лапкамі. Аміна слухала і рабілася смелай, як тая дзяўчынка з казак. Свет падаваўся ёй адкрытым і добразычлівым.

— Бобу, калі я вырасту, то спяку для цябе самы вялікі, самы смачны барбары ў свеце!

— Дзякуй, сонейка маё! — старая пяшчотна гладзіла Аміну па галаве. — Хай усе твае мары спраўдзяцца. Толькі б быў мір. Пакуль людзі жывуць у міры, хлеба хопіць на ўсіх. Калі ж людзі ваююць, няма каму расціць хлеб, няма каму пячы яго... Бяжы, пагуляй з сябрамі!

Дні праходзілі бестурботна, і вечарамі Аміна засынала, шчаслівая, што заўтра яна зноў сустрэне сонца, паслухае новую казку Альты і ўбачыцца з сябрамі.

Але аднойчы ўсё змянілася.

Неяк уночы ў акно крамы прыляцеў камень.

Бацька нічога не сказаў. Ён пакруціў галавою, сабраў аскепкі, паставіў новае шкло і прыладзіў драўляныя створкі, каб закрываць акно ўвечары.

Наступнай ноччу на створках з'явіліся чорныя надпісы.

Аміна яшчэ не ўмела чытаць.

— Што тут напісана? — спытала яна ў бацькі.

— Розныя непрыемныя словы, — адказаў ён. — Ідзі ў дом, прынцэса.

— Я хацела пайсці пагуляць з сябрамі!

— У другі раз, дачушка.

Ні заўтра, ні паслязаўтра Аміна не выходзіла да сяброў, і ніхто з іх не пацікавіўся, што здарылася. Калі ж яна выйшла на вуліцу, то сябры не сталі з ёй размаўляць.

— Табе тут не месца! — сказалі яны.

— Чаму? — спытала Аміна.

Сябры ёй не адказалі. Хлопчыкі ўзялі камяні. Аміна спужалася і пабегла па вуліцы, але спатыкнулася і ўпала. Побач з ёй прызямліўся камень, потым яшчэ адзін. Аміна ўскрыкнула ад жаху.

На крык выйшла з дому старая.

— Ану, пайшлі адсюль! — крыкнула яна і пагразіла кіем крыўдзіцелям Аміны. — Ідзі ў мой дом, сонейка!

Аміна забегла ў дом і расплакалася:

— Што з імі, бобу? Чаму яны гоняць мяне?

— Бывае, што неба выпрабоўвае людзей, — сказала старая. — Яно хоча ведаць, ці ўсе людзі могуць звацца людзьмі. Надышоў гэткі час. А ты не плач, не плач...

Старая гладзіла Аміну па спіне. З кожным дотыкам дзяўчынцы рабілася ўжо не гэтак крыўдна і балюча, як было.

— Я адвяду цябе дадому, каб твой бацька не хваляваўся, — ласкава прамовіла старая.

Світанак быў надзвычай прыгожы. Але сонца ўжо адарвалася ад далягляду, а бацька ўсё не йшоў. Аміна спусцілася ў дом.

— Тата, ну дзе ты? Ты яшчэ спіш?

Бацька не спаў. Ён вымаў з шафаў рэчы і раскладваў іх па куфрах, чамаданах, валізках. Ён падышоў да Аміны, узяў дачку за рукі і сказаў:

— Мы з'язджаем, прынцэса. Паедзем з табою на ўсход — туды, адкуль кожную раніцу паднімаецца сонца! Там, за пустыняй, жылі мае дзядуля і бабуля, пакуль лёс не прывёў іх у гэты край.

— А нашто мы паедзем туды, татуль? — спытала Аміна.

— Тут нам болей не рады.

— Чаму?

— Людзі кажуць, што мы чужыя.

— Але яны елі твой хлеб, а калі прасілі дапамогі, ты нікому не адмовіў! Хіба чужыя гэтак вядуць сябе?

— Усё змяшалася ў свеце, — адказаў бацька. — Аднясі бабулі хлеб! Апошні хлеб з гэтай пякарні.

Бацька працягнуў Аміне свежы праснак.

Аміна, асцярожна азіраючыся, перабегла праз вуліцу і пастукала ў дзверы дома старой.

— Бобу, я прынесла свежы хлеб!

Старая адкрыла:

— Уваходзь, сонейка.

Аміна паклала хлеб на стол і сумна сказала:

— Ведаеш, бобу, мы з'язджаем…

— Ведаю. У мяне для цябе падарунак. Я рыхтавала яго да твайго дня нараджэння, але цябе ўжо тут не будзе, так што я аддам яго табе зараз.

Альта дастала з шафачкі смешную шытую ляльку з чорнымі валасамі і карычневымі вачамі-гузікамі:

— Вось, глядзі!

Аміна ўзяла ляльку і прыціснула да грудзей:

— Яна прыгожая! Дзякуй!

— Ёй трэба даць імя! — сказала старая.

Аміна ўважліва, сур'ёзна паглядзела на ляльку.

— Я буду зваць яе Бобу.

Старая ўсміхнулася:

— Няхай Бобу беражэ цябе, прынцэса! Пакуль яна з табой, я буду ведаць, што ў цябе ўсё добра.

— Як ты застанешся тут без нас? — спытала Аміна. — Людзі будуць гаварыць усякае...

— Я дужа старая, каб хвалявацца, што пра мяне кажуць. Хай пражывуць з маё. Ну, бяжы! Бацька чакае цябе.

— Я вярнуся да цябе, бобу! — Аміна моцна абняла старую і пабегла на вуліцу, дзе ўжо тарахцеў матор грузавічка.

Бацька пасадзіў Аміну ў кабіну. Яна не бачыла, як старая махала ім услед, пакуль машына не схавалася за паваротам, а потым доўга глядзела, як на цёплую дарогу асядае пыл.

На новым месцы было няўтульна. Людзі размаўлялі па-іншаму, па-іншаму апраналіся, не было цудоўных світанняў над пустыняй, затое былі моцныя вятры, якія прыносілі з сабою пясок і маланкі. Але бацька адкрыў пякарню, і водар хлеба нагадваў Аміне пра дом, што яны пакінулі далёка на захадзе, і пра старую з яе чароўнымі казкамі. Перад сном дзяўчынка цяпер сама расказвала казкі — сваёй лялькі Бобу. Калі ж налятаў вецер і прыгінаў дрэвы да зямлі, то Аміна выходзіла на парог і крычала:

— Татуля, глядзі, як моцна бобу хоча мяне абняць!

Жыццё наладжвалася. У пякарню прыходзілі людзі па лавашы і барбары, а ў Аміны з'явіліся новыя сябры.

Аднак раптам уначы зямля здрыганулася і трэснула. Адзін раз, другі, трэці... Сцены пакоя, у якім спала Аміна, абваліліся, а сама дзяўчынка апынулася пад ложкам. Аміна вельмі доўга ляжала ў цемры і цішыні, плакала, клікала бацьку і абдымала ляльку. Потым, калі ў дзяўчынкі скончыліся слёзы, яна пачула, як гаўкае сабака і крычаць людзі. Ратавальнікі выцягнулі яе на свет і перадалі ў рукі бацьку. Бацька цалаваў Аміну і дзякаваў Богу, што той захаваў ім абаім жыццё.

Акрамя жыцця не захавалася нічога. Горад ляжаў у руінах.

Бацька дапамагаў мужчынам разбіраць завалы, пакуль у яго былі сілы. Начавалі яны з Амінай у валанцёрскім палатклавым лагеры.

Аднойчы бацька вярнуўся ў лагер і сказаў:

— Наўрад ці мы знойдзем яшчэ жывых. Ратавальнікі згортваюць пошукі. Трэба думаць, што нам з табою рабіць далей, прынцэса.

— Я не ведаю. Калі б тут была бобу, яна б дала правільную параду, — адказала Аміна. Яна паглядзела на ляльку, якая ляжала побач на матрацы, і заўважыла, што ў той раз'ехалася шво на назе.

Аміна ўзяла ляльку. З-пад той выкацілася фасоля і ўпала на падлогу.

Дзяўчынка пацягнула за нітку. З нагі Бобу з вясёлым шумам пасыпаліся фасоліны. Аміна пацягнула за нітку на другой назе — і адтуль высыпаўся нут. Тады Аміна выцягнула і перакусіла нітку на лялечнай спіне.

— Тата, глядзі, глядзі! — прашаптала дзяўчынка.

Пад фасоляй, у чыстай белай анучцы, перахопленай чырвонай ніткай, быў прыхаваны тугі скрутак грошай.

Бацька абняў Аміну, і яны заплакалі.

Аўтобус шпарка каціў па дарозе. Аміна ўвесь час глядзела ў акно. Ёй нядаўна споўнілася дваццаць тры, і яна вярталася ў горад свайго дзяцінства, дзе больш не палымнелі нянавісць і страх. Вось тая самая вуліца! А вось і той самы дом — гэткі ж чысценькі і прыбраны, толькі дзверы перафарбаваныя.

Аміна выйшла з аўтобуса і дастала з заплечніка свежы духмяны хлеб. Колькі ўсяго яна хацела расказаць сваёй бобу! Што ў іх з бацькам цяпер некалькі пякарняў, і што яна, Аміна, скончыла ўніверсітэт і вырабляе гэткіх прыгожых лялек, што па іх стаіць чарга пакупнікоў!

Аміна пастукала ў дзверы і пракрычала:

— Бобу, хлеб!

Дзверы адкрыла дзяўчынка гадоў шасці.

— Прывітанне! — сказала Аміна. — А дзе бобу? Дзе... Альта?

— Не ведаю, хто такая Альта, — адказала дзяўчынка.

— Тут раней жыла старая! — пачуўся з дома жаночы голас.

Да дзвярэй падышла жанчына. Яна паглядзела на Аміну і дадала:

— Калі мы купілі гэты дом сем гадоў назад, ён ужо два гады стаяў пусты. А дзе пахаваная старая — я не ведаю.

— Дзякуй, — сказала Аміна. — Гэта вам.

Яна аддала жанчыне хлеб і адышла ад дзвярэй.

Вечарэла.

У вокнах дома, дзе калісьці жылі яны з бацькам, загарэлася святло.

Аміна паволі пайшла па вуліцы і неўзабаве выйшла з горада. Перад ёй ляжала ўсыпаная камянямі, нагрэтая за дзень сонцам пустыня. Над пустыняй ззялі буйныя зоркі.

Аміна села на вялікі цёплы камень і паглядзела на неба.

— Добры вечар, бобу! — прашаптала яна. — Я вярнулася. У мяне для цябе столькі навін!

Архіўныя таямніцы

# «ГУМЕНЦА, КРЫТАЕ САЛОМАЙ, АД ДОЎГІХ ЧАСАЎ ПАСІВЕЛА...»

## З гісторыі стварэння першага беларускага скансэна

**У падмурку кожнай значнай з'явы культуры — нечая задума, ідэя, нечы энтузіязм... Часам выток губляецца ў цемры гісторыі, часам адбываецца чарговая несправядлівасць, і заслуга стварэння прыпісваецца іншым... Здараецца, што слушную ідэю, затаптаную неспрыяльнымі абставінамі, адраджаюць наступнікі... Тым не менш заўсёды цікава знаходзіць звесткі пра ўзнікненне тэатра, творчага аб'яднання, выдавецтва, музея...**



Фота БелТА.

### ДА ВЫТОКАЎ ПТАЛЕМЕЕВА ХРОНАСА

Калісьці ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва я знайшла велізарны спіс, складзены мастаком Яўгенам Кулікам разам з сябрамі адносна таго, якія музеі варта стварыць у Беларусі. Гэта была такая вялізная папяровая «прасціна», склееная з аркушаў, дзе можна знайсці і тыя праекты, якія здзейсніліся ці здзяйсняюцца сёння, — прыкладам, музей Максіма Багдановіча ў Ракуцёўшчыне, Юравіцкая палеатычная стаянка, пазначаная як «самае старажытнае паселішча на тэрыторыі Беларусі», музей-аптэка ў Гродне ці музей гісторыі Мінска ў аднаўленай Мінскай ратушы. Ёсць там такія прапановы, як мемарыялізацыя вытоку Нёмана — «легендарнага Хронаса Клаўдзія Пталемея», стварэнне музея беларускага плытагонства, музеі — дзеючыя батлейкі, музеі «Мінская гімназія» і «Слуцкая гімназія», музей Мінскага антыфашысцкага падполля ў Старым горадзе і Музей нацыянальнай вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Больш за сотню пунктаў.

Ёсць на тых аркушах і прапанова стварэння археалагічнага музея «Строчыцкае гарадзішча». Гэта там, дзе сёння знаходзіцца Музей народнай архітэктуры і побыту, у Мінскім раёне паміж вёскамі Азярцо і Строчыцы — унікальны этнаграфічны комплекс пад адкрытым небам, першы музей-скансэн на Беларусі. Ідэя стварыць падобны музей належала яшчэ Фердынанду Рушчыцу, ён гаварыў пра гэта ў 1908 годзе, але так і не здзейснілася — не да таго было. Першая сусветная вайна, Грамадзянская, потым Вялікая Айчынная... Потым аднаўленне пасля ваеннай разрухі... У 1950-х схамянуліся беларусы — дык не так шмат да старой народнай архітэктуры засталося!

### ВАЗОК, КАЛЁСЫ, ПАНАРАДЫ

А нядаўна ў архівах таго ж БДАМЛМ я знайшла рукапіс ліста, надрукаванага ў газеце «Літаратура і мастацтва», згодна з паэнакай, 25 жніўня 1966 года. Ліст мае назву «Створым этнаграфічны музей».

«Для пачатку нагадаем некалькі радкоў з бессмяротнага твора Якуба Коласа «Новая зямля» — гэтай энцыклапедыі дарэвалюцыйнага жыцця беларусаў. Памятаеце? —

*На прыгуменні, поруч з садам,*
*Павець з гумном стаяла радам,*
*А пад паветкаю прылады:*
*Вазок, калёсы, панарады,*
*Старыя сані, восі, колы,*
*І вулляў некалькі на пчолы,*
*Яшчэ няскончаных; судзіна,*
*Стары цабэрак, паўасьміна...*
*Гуменца, крытае саломай,*
*Ад доўгіх часаў пасівела...»*

Так паэтычна пачынаецца ліст, каб нагадаць пра самабытнасць беларускай народнай сядзібы, на якой мужык не толькі гібеў, «але і колькі прыгажосці стваралася тут мазольнымі мужычымі рукамі, колькі шчаслівых хвілін правёў тут «бядак пахілы», вырабляючы тыя ж «вазкі, калёсы, панарады», колькі цудоўных песень і казак нарадзілася пад саламянай страхой яго курнай хаты!»

Рэдактарская рука ўпісала слова «вырабляючы» замест ужытага ў тэксце «вымаглёўваючы». Нядзіўна: слова такога ў слоўніках няма, магчыма, гэта абдрукоўка, і аўтары ліста хацелі ўжыць слова «выгаблёўваючы». Вось рэдактар і паправіў тое «вымаглёўваючы» на ўцямнае «вырабляючы».



Далей у лісце развагі, што старая вёска адджывае. ***«Ідзе натуральны працэс адмірання старога. Знікаюць прадметы побыту, якімі карысталіся сяляне стагоддзямі. Разбіраюцца на дровы струхнелыя дзедаўскія і прадзедаўскія хаты. Жанчыны здаюць на ўтыль рэшткі таго адзення і тканін, якія некалі шылі ці ткалі іх бабулі і прабабулі... Пройдзе яшчэ дзесяцігоддзе і не знойдзеш на вёсцы ні кроснаў, ні прасніцы, ні лапцей. Ужо сёння амаль немагчыма адшукаць людзей, якія б умелі плесці лапці, рабіць лубяныя кашы, рэшаты і падсіткі, драўляныя лыжкі і апалонікі...»***

У гэтым фрагменце ліста зноў рэдактарская праўка — упісана «на ўтыль» замест ужытага калалытнага слова «рызнікам» («здаюць рызнікам рэшткі таго адзення і тканін», то-бок «тряпичникам»). Што, уласна кажучы, якраз ілюструе працэс знікнення аўтэнтыкі, пра які гаворыцца ў лісце, толькі ў мове.

І каб не забывацца свайго, каб наша гісторыя не загінула, не знікла бясследна, аўтары ліста прапаноўваюць стварыць *«этнаграфічны музей пад адкрытым небам, або філіял Дзяржаўнага музея Беларускай ССР, што ўяўляў бы сабою цэлую вёску з рознага тыпу дамоў, гаспадарчых і іншых збудаванняў, зцягненых з усіх куткоў Беларусі, дзе была б дакладна ўзноўлена абстаноўка, у якой жылі нашы людзі на працягу апошніх стагоддзяў»*.

Пасля гэтых радкоў ліст склееены, па краях склейкі відаць праўкі чырвоным алоўкам і атрамантам, магчыма, так знаходзіўся выкраслены фрагмент.

Потым ідзе абгрунтаванне падзелу музея на часткі паводле рэгіёнаў Беларусі:

*«Зямля наша мае шмат цікавых куткоў, і побыт нашых людзей, які складваўся на працягу стагоддзяў, у розных месцах таксама разнастайны і своеасаблівы. Гомельшчына не падобна на Брэстчыну, Полаччына на Навагрудчыну. Розныя тут і архітэктура хат, і гаспадарчых будынкаў, розныя прадметы хатняга ўжытку, рознае адзенне, прылады працы. Музей дапаможа ўбачыць усё гэта наглядна».*

А як прыклад такога музея прыводзіцца Латвійскі этнаграфічны музей у Рызе і славутыя Кіжы ў Петразаводску. *«Такія музеі дазваляюць захаваць ад вякі помнікі своеасаблівага драўлянага дойлідства, у іх жа захаваны і ўзноўлены побыт нашых продкаў... У такім музеі юныя наведвальнікі не з падручнікаў па гісторыі, а ўбачаўшы зразумеюць, як жылі іх прадзеды. Мастакі змогуць убачыць і адчуць у музеі вытокі і традыцыі дэкаратыўна-прыкладнога народнага мастацтва, змогуць уклаўшы ў ім той асаблівы народны, нацыянальны дух і каларыт, які дапаможа ім стварыць глыбоканацыянальныя сучасныя творы мастацтва...»*

### АЎТОГРАФЫ ЗОРАК

Аўтары абгрунтоўваюць значэнне такога этнаграфічнага музея, які аб'яднае і краязнаўчыя школьныя гурткі, і шматлікіх энтузіястаў-аматараў, і навукоўцаў і павінен знайсці падтрымку ў шырокай грамадскасці. Справа не на адзін год...

*«Але ўжо сёння трэба неадкладна вырашыць шэраг пытанняў. Неабходна, напрыклад, ужо сёння прадугледзець месца, дзе будзе створаны музей. Мясцовасць павінна мець характэрны беларускі ландшафт, добрыя пад'езды для турыстаў і экскурсантаў. Нам здаецца, што для гэтага падыдзе адзін з куточкаў на беразе Мінскага мора. Сёння там ідзе значнае будаўніцтва, таму трэба тэрмінова, загадзя паклапаціцца, каб пакінуць пад музей пэўны ўчастак. Па-другое, неадкладна трэба правесці вялікую прапагандысцкую і растлумачальную работу сярод*



*насельніцтва, звярнуцца да краязнаўчых музеяў, школьных краязнаўчых гурткоў з просьбай, каб людзі адшуквалі і захоўвалі тое, што засталося ў нас этнаграфічна каштоўнага.*

*Стварэнне Беларускага этнаграфічнага музея пад адкрытым небам — важная дзяржаўная справа. І яе трэба вырашыць неадкладна».*

У канцы ідуць прозвішчы аўтараў ліста з іх уласнаручнымі аўтографамі. Калі ліст, падобна, не першы асобнік, дык прозвішчы і пасады аўтараў надрукаваныя не пад капірку і аўтографы аўтэнтычныя. А падпісанты — гэта цвет беларускай творчай інтэлігенцыі таго часу:

*«П. Броўка, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР;*

*П. Глебка, дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору;*

*Б. Платонаў, народны артыст СССР;*

*Р. Шырма, народны артыст СССР;*

*К. Крапіва, народны пісьменнік Беларусі;*

*І. Ахрэмчык, народны мастак БССР;*

*Ул. Стэльмашонак, старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР;*

*В. Аладаў, старшыня праўлення Саюза архітэктараў БССР».*

Да такога зорнага складу не маглі не прыслухацца! Распісаліся ўласнаручна на гэтым асобніку ўсе аўтары ліста, акрамя мастакоў — Ахрэмчыка і Стэльмашонка. Магчыма, іх подпісы былі на іншым асобніку, у любым выпадку, у газеце іх надрукавалі. Відаць, што людзі падпісваліся рознымі ручкамі, чарнілам розных колераў, значыць, нехта ездзіў, збіраў подпісы. Цікава, хто аўтар тэксту? Верагодней за ўсё, хтосьці з пісьменнікаў, а хто? Броўка, Глебка ці Кандрат Крапіва? Ці сачыняў не адзін чалавек?

Пастанова аб стварэнні першага на Беларусі музея-скансэна была прынята 9 снежня 1976 года — гэтая дата і лічыцца днём нараджэння музея. Для лакацыі скансэна выбралі ўсё-ткі не раён Мінскага мора, як прапаноўвалася ў лісце, а месца, непадалёк ад якога, паводле адной з версій, на рацэ Менцы быў заснаваны старажытны Менск.

Ствараўся Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту не адзін год: здзяйснялася шмат навуковых экспедыцый па рэгіёнах, вывучалі і даследавалі аб'екты. А колькі цяжкасцяў перадолена, калі разбіралі пабудовы з розных вёсак і мясцэчак, прывозілі іх у вёску Азярцо, потым манціравалі наноў... Як прапаноўвалася, музей падзелены на этнаграфічныя рэгіёны: Паазер'е, Падняпроўе і Цэнтральную Беларусь. Сёння ў склад экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ўваходзяць каля 40 аб'ектаў, створаных у канцы XVII — пачатку XX стагоддзя. Едуць туды не толькі падзівіцца на экспанаты, але і на розныя фэсты — ад рыцарскага да спаборніцтва званароў, паўдзельнічаць у старажытных абрадах ці навуковых канферэнцыях, павучыцца ў народных майстроў, патанчыць, паспяваць... І натхніцца беларускай народнай культурай. Усё, як марылі аўтары колішняга ліста.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ЗАХАВАЛЬНІКІ ГІСТОРЫІ

## Дакументы звязваюць мінулае і будучыню

**У мінулую нядзелю архівісты адзначылі сваё прафесійнае свята. Дата 6 кастрычніка для Дня архівіста абрана невыпадкова: менавіта 6 кастрычніка 1994 года быў прыняты першы ў гісторыі Беларусі спецыяльны Закон «Аб нацыянальным архіўным фондзе і архівах Рэспублікі Беларусь». За 30-гадовы перыяд сучасная развіцця архіўная галіна прайшла значны эвалюцыйны шлях. Сёння архівы — не проста ўстановы, у якіх захоўваюцца дакументы, а сапраўдныя гісторыка-асветніцкія цэнтры. Як адзначыў падчас сустрэчы ў Нацыянальным прэс-цэнтры дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Алег ВОІНАЎ, роля архіваў — звязваць мінулае і будучыню.**

### РАБОТА НА АПЯРЭДЖВАННЕ

Сярод асноўных задач, якія стаяць сёння перад архівамі, — камплектаванне, захаванне і папулярызацыя дакументаў. Штогод нашы архівы папаўняюцца на больш чым сто тысяч адзінак захоўвання. Гэтыя дакументы маюць гістарычнае, навуковае, сацыяльнае, палітычнае і культурнае значэнне. На сёння нацыянальны архіўны фонд — 13 мільёнаў 840 тысяч адзінак захоўвання. Дзякуючы падтрымцы дзяржавы, істотна ўмацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база: рэканструіруюцца, перапрафіліруюцца будынкі пад захоўванне дакументаў. Так, сёлета адкрыліся новыя архіўныя сховішчы ў Гомелі і Віцебску, на завяршальным этапе рэканструкцыя ў Магілёве і Гродне. Ужо прайшоў экспертызу праект па будаўніцтве новага архіва ў Мінску, які будзе здольны прыняць 1,5 мільёна адзінак захоўвання. Дзякуючы такім захадам, установы змогуць зберагаць ужо больш як 3 мільёны дакументаў, а гэта работа на апярэджванне — бо такіх плошчаў хопіць на тое, каб прымаць новыя крыніцы 8—10 гадоў. Ва ўстановах праводзяцца капітальныя і бягучы рамонты. Практычна ва ўсіх архівах адрамантаваны і забяспечаны новым абсталяваннем чытальныя залы, што дазваляе стварыць камфортныя ўмовы для наведвальнікаў. З набыццём сучаснага сканавальнага абсталявання павялічыліся аб'ёмы алічбоўкі архіўных дакументаў. Толькі за гэты год будзе пераведзена ў лічбу каля 1 мільёна 900 тысяч электронных старонак. Штогод праводзяцца работы па рамонце і рэстаўрацыі архіўных дакументаў, звыш 60 тысячам лістоў архіўных дакументаў даецца другое жыццё.

**Сёння архівы займаюцца і выдавецкай дзейнасцю. На высокі ўзровень такая работа пастаўлена ў Нацыянальным архіве. Тут нават створаны аддзел публікацый. Яго супрацоўнікі працуюць над зборнікамі дакументаў, манаграфіямі, даведнікамі, прэзентацыйнымі альбомамі, навукова-папулярнымі выданнямі.**

У межах выканання даручэння прэм'ер-міністра ад 5 жніўня 2022 года пры наведванні архіва кінафотафонадакументаў, вялікая ўвага ўдзяляецца інфармацыйна-асветніцкай рабоце. «Мы разумеем, што дакументальныя крыніцы — гэта дзейсны інструмент супрацьдзеяння спробам фальсіфікацыі айчыннай гісторыі», — адзначыў Алег Воінаў. Таму супрацоўнікі архіваў рыхтуюць і прэзентуюць звыш 350 выставачных праектаў. Дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў за некалькі гадоў у рамках праекта «Біяграфія маёй краіны» было створана каля 250 відэасюжэтаў, якія асвятляюць важныя падзеі і знамянальныя даты. Сёлета створана больш чым дзевяць дакументальных фільмаў, прысвечаных вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Упершыню Дэпартаментам па архівах і справаводстве арганізаваны і праведзены прэм'ерны паказ дакументальнага фільма «Вызваленне» ў адзін дзень і час адразу ў 16 гарадах. Наогул, праведзена больш як 500 мерапрыемстваў па дэманстрацыі ва ўстановах адукацыі і на прадпрыемствах кінафотафонадакументаў.

Асветніцкай работай ахоплена падрастаючае пакаленне. У межах рэспубліканскай акцыі «Архівы — школе» з 2022 года праведзена звыш 2,5 тысячы мерапрыемстваў, якія наведалі больш 35 тысяч школьнікаў і студэнтаў. Для навучэнцаў чытаюцца лекцыі, дэманструюцца хронікі, праводзяцца экскурсіі па архівах.

### ЗАЗІРНЁМ У ПАРТЫЗАНСКІ АРХІЎ

Сёння архівы займаюцца і выдавецкай дзейнасцю. На высокі ўзровень такая работа пастаўлена ў Нацыянальным архіве. Тут нават створаны аддзел публікацый. Яго супрацоўнікі працуюць над зборнікамі дакументаў, манаграфіямі, даведнікамі, прэзентацыйнымі альбомамі, навукова-папулярнымі выданнямі.

— Гістарычная памяць, падзеі Вялікай Айчыннай вайны — сёння ключавыя тэмы ў рабоце Нацыянальнага архіва, — заўважыў намеснік дырэктара Нацыянальнага архіва Святаслаў Кулінок. — Тут шэраг аспектаў, якія вывучаюцца ўжо не першы год: акупацыйны перыяд, генацыд, спаленыя вёскі (у рамках гэтай тэмы выдадзена 13 зборнікаў дакументаў, і гэта фактычна самастойны навуковы кірунак), гісторыя партызанскага руху, мемарыялізацыя памяці, аднаўленне Рэспублікі Беларусь пасля вайны.

На сёння Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь адзіны на постсавецкай прасторы, дзе сістэмна вывучаюцца карныя аперацыі, уводзяцца ў навуковае абарачэнне новыя архіўныя дакументы. Дзякуючы рабоце Генеральнай пракуратуры, у рамках даследавання крымінальнай справы аб генацыдзе вядома, што буйных карных аперацый было не менш як 187. У сувязі з гэтым Нацыянальным архівам выдадзены зборнікі «Зімняе чараўніцтва», «Котбус» і «Кармаран» . Сёлета быў надрукаваны зборнік дакументаў аб злачынствах у ходзе карных аперацый супраць партызан Полацка-Лепельскай партызанскай зоны «Імжа» і «Вясенняе свята». Цяпер на гэтай тэрыторыі ў раёне Ушач знаходзіцца мемарыяльны комплекс «Прарыў». У зборніку надрукавана больш за 560 дакументаў, большасць з іх уведзена ў навуковае абарачэнне ўпершыню. На лістапад запланавана прэзентацыя зборніка «Зімняе чараўніцтва». Гэта другое выданне, выпраўленае і дапоўненае новымі дакументамі. Актуалізаваны звесткі па злачынствах фашыстаў і іх паслугачоў, па знішчаных вёсках.

Новы выдавецкі праект «Партызанскі архіў» у першую чаргу арыентаваны на моладзь. Гэта кнігі невялікага аб'ёму (да 50 старонак), добра ілюстраваныя, напісаныя ў навукова-папулярным стылі. Для іх выбіраюцца цікавыя, раней мала вывучаныя тэмы. Напрыклад, сёлета выйшла кніга «Мастацкая творчасць партызан», на наступны год плануецца выдаць кнігі з распаведам пра жанчын-партызанак і пра побыт народных мсціўцаў (як апраналіся, што елі, як наладжвалі жыццё ў лесе, бавілі вольны час). У рамках гэтага праекта — не толькі выданне кніг, але і правядзенне штогадовай міжнароднай канферэнцыі, дзіцячых партызанскіх чытанняў, падрыхтоўка зборнікаў артыкулаў.

Пра выданне кнігі «Аперацыя Баграціён. Партызаны беларускай зямлі» Святаслаў Кулінок сказаў, што гэта першы сур'ёзны вопыт работы і Нацыянальнага архіва, і архіўнай галіны ў цэлым на вельмі высокім узроўні. Праект рэалізоўваўся ў рамках праграмы «Бібліятэка Саюзнай дзяржавы». Непасрэднае кіраўніцтва і куратарства вёў дзяржсакратар Дзмітрый Мезенцаў. 22 чэрвеня адбылася прэзентацыя кнігі. Ужо можна сказаць, што праект атрымаўся — тыражы разышліся, адчуваецца запатрабаванасць у навуковай супольнасці, у грамадстве. У аснове праекта — дакументы, але стыль выкладання, афармленне зроблены так, каб кніга была зразумелай любому, хто ўзяў яе ў рукі.

**На наступны года запланаваны шэраг выдавецкіх праектаў, звязаных з 80-годдзем Вялікай Перамогі. Сярод іх — сумесны праект беларускіх і расійскіх архівістаў пра карныя аперацыі нацыстаў на расійска-беларускім памежжы. Гэты праект звязаны з падрыхтоўкай зборніка па «Суражскіх варотах» — пакуль малавядомай у шырокім грамадстве староны гераічнай партызанскай барацьбы.**

На наступны год запланаваны шэраг выдавецкіх праектаў, звязаных з 80-годдзем Вялікай Перамогі. Сярод іх — сумесны праект беларускіх і расійскіх архівістаў пра карныя аперацыі нацыстаў на расійска-беларускім памежжы. Гэты праект звязаны з падрыхтоўкай зборніка па «Суражскіх варотах» — пакуль малавядомай у шырокім грамадстве староны гераічнай партызанскай барацьбы.



**Людміла Студзінская — вядучы архівіст аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. У яе руках — альбом бацькі Максіма Багдановіча Адама Ягоравіча, вядомага этнографа. У альбоме захоўваюцца старыя сямейныя фота перыяду 1896—1908 гадоў.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

### НОВЫ СТАРЫ ЛЕТАПІС

З 2022 года архівы развіваюць новы кірунак: тут робяць не толькі простыя відэаролікі, але і дакументальныя стужкі. Адным з імпульсаў да гэтага стала падтрымка дзяржавы, дзякуючы якой Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў набывае сучаснае абсталяванне па рабоце з аўдыявізуальнымі дакументамі, па іх рэстаўрацыі, праглядзе, сканаванні.

